ЯК ПАЗБАВІЦЦА АД СТРАХАЎ

8

«ПАКІНЬЦЕ МНЕ МОВУ МАЮ...»

9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

22 СТУДЗЕНЯ 2020 г. СЕРАДА № 13 (29127)

ЦЫТАТА ДНЯ

Віктар ЛІСКОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі:

«У рабоце з адзінокімі, пажылымі людзьмі павінен дзейнічаць выяўляльны прынцып. Не трэба чакаць, каб чалавек ішоў з праблемамі па інстанцыях. Трэба прыйсці да яго і прапанаваць сацыяльныя паслугі, якія яму неабходныя. Тады людзі будуць верыць у нас і разумець, што калі трапіш у няпростую жыццёвую сітуацыю, ёсць сацыяльная абарона».

КАРАТКА

- **Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка прадставіў учора калектыву Міністэрства абароны новага кіраўніка Віктара Хрэніна і начальніка Генеральнага штаба ЎС Аляксандра Вальфовіча.**
- Беларусь заняла 5-е месца ў рэйтынгу краін з танным інтэрнэтам.
- **Тэхнапаркі плануюць стварыць яшчэ ў пяці гарадах Беларусі: Баранавічах, Барысаве, Бабруйску, Оршы і Маладзечне.**
- На возеры Асвейскім забаронена плаваць на лодках да 1 сакавіка. Рашэнне прынята ў сувязі з двума трагічнымі выпадкамі, у выніку якіх загінулі чатыры чалавекі.
- **У Беларусі плануюць адмовіцца ад пластыкавай тары для напояў аб'ёмам больш за 1 л.**
- Аб'яўлены конкурс архітэктурна-дызайнерскіх праектаў па абнаўленні Брэсцкага драмтэатра.
- **Подпісы «в.а.» і «час.в.а.» знікнуць з дакументаў.**

ISSN 1990 - 763X

ЯК НАРАДЖАЕЦЦА КНІГА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пераплётчыца Надзея БРУЙ за работай.

З паліграфістамі сталічнага прадпрыемства «Транстэкс» я пазнаёміўся выпадкова. Справа ў тым, што тут друкуецца фотаальбом пад назвай «Пад небам Беларусі», які прысвечаны Году малой радзімы, аўтарам якога з'яўляюся я. Дзякуючы сумеснай рабоце над выданнем мне пашчасціла паназіраць, як працуюць паслядоўнікі славутага Скарыны — сучасныя друкары-кніжнікі. А заадно і пазнаёміцца з некаторымі з іх.

СТАР. 13

Па палічках

НОВАЕ Ў ПРАФЕСІЙНЫМ ПЕНСІЙНЫМ СТРАХАВАННІ

Змены могуць закрануць каля 350 тысяч чалавек

Падыходы да налічэння пенсій некаторым катэгорыям работнікаў зменены. На мінулым тыдні Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 15 «Аб змяненні ўказаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», які рэгулюе датэрміновае пенсійнае забеспячэнне работнікаў з асаблівымі ўмовамі працы і занятых асобнымі відамі прафесійнай дзейнасці.

Згодна з дадзеным указам тым, хто выпрацаваў на 1 студзеня 2009 года не менш за палову неабходнага льготнага стажу ў асаблівых умовах працы, даецца права на прызначэнне датэрміновай ільготнай пенсіі ў агульнай пенсійнай сістэме ўзамен датэрміновай прафесійнай пенсіі ў сістэме прафесійнага пенсійнага страхавання.

Чаму запатрабаваліся змены?

Да 2009 года датэрміновая пенсія выплачвалася з агульнай пенсійнай сістэмы. Пры гэтым людзі мелі магчымасць працягваць працаваць на ранейшых рабочых месцах. З 1 студзеня 2009 года ў нашай краіне была ўведзена сістэма прафесійнага пенсійнага страхавання работнікаў з асаблівымі ўмовамі працы. Сродкі для выплаты такіх пенсій, атрыманыя ў выніку спецыяльных узносаў работадаўцаў, сталі назапашвацца на рахунку кожнага работніка, а пры выхадзе на прафесійную пенсію чалавек павінен быў пакінуць сваё рабочае месца.

Пры гэтым быў устаноўлены пераходны перыяд. Тыя, хто адпрацаваў пасля 1 студзеня 2009 года менш за 10 гадоў і пры гэтым мае неабходны стаж, атрымліваюць датэрміновую пенсію па ранейшых правілах. А тыя, хто пасля 2009 года працаваў у асаблівых умовах звыш 10 гадоў, пры наяўнасці неабходнага стажу маглі разлічваць толькі на пенсію, разлічаную па новых правілах.

СТАР. 4

Кузня чэмпіёнаў

На канюшню пяць разоў на тыдзень

Як жыве адзіная школа коннага спорту ў Мінскай вобласці

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Сёлета дзіцяча-юначай спартыўнай школе прафсаюзаў коннага спорту імя Дзяменцьева споўнілася 35 гадоў. Установа ўнікальная ўжо хоць бы тым, што гэта адзіная спартыўная школа па конным спорце ў Мінскай вобласці, якая размясцілася ў вёсцы Зазер'е Пухавіцкага раёна. За нядоўгую гісторыю ў сценах ДЮСШ выросла 124 майстры спорту і прыблізна столькі ж кандыдатаў у майстры спорту. Сёння тут трэніруецца 62 дзіцяці не толькі з Зазер'я, але і з навакольных вёсак. Многія прыязджаюць і з Мінска.

СТАР. 5

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ДЫВЕРСІФІКАВАЦЦА НАМ ТРЭБА»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў з кіраўніцтвам урада і нафтаперапрацоўчай галіны магчымасць альтэрнатыўных паставак нафты і павышэння эфектыўнасці экспарту нафтапрадуктаў

«Мы павінны на гэтай нарадзе ў вузкім коле спецыялістаў разгледзець пытанне пра далейшую работу нашага нафтахімічнага комплексу, — абазначыў тэму сустрэчы кіраўнік дзяржавы. — У дадзеным выпадку пытанне стаіць пра пастаўкі нафты ў Беларусь, у тым ліку з сусветных рынкаў, не толькі з Расійскай Федэрацыі, што мы ўжо пачалі рабіць. Мы павінны паглядзець, у што гэта выльецца».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што пытанне дыверсіфікацыі паставак нафты не траціць сваёй актуальнасці. «Сапраўды, цяпер у поўным аб'ёме няма альтэрнатывы пастаўкам расійскай нафты. Але, як мы і дамаўляліся, дыверсіфікавацца нам трэба. ***Трэба ісці да таго, каб працэнтаў 30-40 купляць у Расійскай Федэрацыі, працэнтаў 30 мы павінны з Балтыкі завозіць нафты, працэнтаў 30 — праз Украіну праверaным ужо шляхам.*** Магчыма, Казахстан зможа паставіць нам нафту, калі Расія пагодзіцца з гэтым. Дзіўна: наш саюзнік не дае згоды на пастаўку нафты ад нашага іншага саюзніка. Што ж, такая сітуацыя цяпер па пастаўках нафты, і мы павінны з гэтым разабрацца», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Але самае важнае пытанне — перапрацоўка нафты і далейшы продаж нафтапрадуктаў — гэта для эканомікі значны рэсурс. Праблемы ёсць і тут — з-за ўвядзення Расійскай Федэрацыяй падатковага манеўру непазбежна зніжаюцца даходы рэспубліканскага бюджэту, пагаршаецца эфектыўнасць работы айчынных нафтаперапрацоўчых заводаў. НПЗ сутыкнуліся з праблемай фінансавання бягучай дзейнасці і, што немалаважна, сваіх інвестыцыйных праграм, накіраваных на развіццё вытворчасці. Але тут кіраўнік дзяржавы быў катэгарычны: ***«Гэтыя аргументы я нават да ўвагі прымаць не хачу. Вайны няма. У свеце грошай мора. Ёсць кіраўнікі канцэрнаў, ва ўрадзе — віцэ-прэм'ер, кіраўнікі заводаў. Вырашайце пытанні».***

Фота БелТА.

Кіраўнік дзяржавы папрасіў паведаміць прагнозы развіцця сусветнага рынку нафты і нафтапрадуктаў на найбліжэйшы час і на сярэднетэрміновую перспектыву, а таксама тое, якія ўрад бачыць рэзервы па павышэнні эфектыўнасці экспарту нафтапрадуктаў у цяперашніх умовах.

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў аб персанальнай адказнасці за ўсе прапановы. ***«Калі хтосьці бачыць, што мы экспартаваць можам прадукцыю па двух-трох каналах або манапалізаваць працэс экспарту, — кожная прапанова павінна быць разгледжана,*** — сказаў лідар дзяржавы. — А то ў нас разважанняў шмат, балбатні шмат, рашэнні з-за балбатні не прымаюцца, а калі рашэнне прымуць, потым няма з каго спагнаць».

Ён яшчэ раз падкрэсліў, што нават калі кіраўнікі не застануцца на сваіх пасадах, будуць «галавой адказваць за прынятыя рашэнні».

Перасцярог Аляксандр Лукашэнка прысутных і ад прыватных прыхільнасцяў і інтарэсаў.

«Увесь свет працуе, прыкладаў шмат, любы бярыце з іх і давайце ў гэтым кірунку дзейнічаць», — звярнуўся да ўдзельнікаў нарады Прэзідэнт.

ПЕРАГАВОРЫ ПРАЦЯГВАЮЦЦА

«Немалаважным аспектам нарады было павышэнне эфектыўнасці як, уласна, аперацыйных выдаткаў нашых заводаў, так і рэалізацыі нафтапрадуктаў на знешнім перыметры, — пракаментаваў вынікі размовы з Прэзідэнтам **кіраўнік «Белнафтахіма» Андрэй РЫБАКОЎ.** — Размова ідзе пра найбліжэйшыя рынкі: Украіну, Польшчу, Прыбалтыку. Дадзены канкрэтныя даручэнні наконт працягу работы па ўсіх гэтых кірунках. У найбліжэйшы час нас чакае маштабная, планамерная праца, разлічаная нават не на адзін год, а на будучыя два-тры гады».

Беларусь пакуль не выйшла на запланаваныя ў студзені—лютым аб'ёмы экспарту нафтапрадуктаў, удакладніў ён, тым не менш пасля невялікага перапынку знешні продаж аднавіўся.

Пачатку разгрузкі нарвежскай нафты, пра пастаўкі якой нядаўна ўдалося дамовіцца, канцэрн чакае ўжо ўвечары 22 студзеня.

«Альтэрнатыўныя пастаўкі прапрацоўваюцца, не буду анансаваць, але ёсць ужо гатовыя кантакты, гэта датычыцца не толькі самой нафты, але і лагістычных каналаў яе паступлення, — сказаў Андрэй Рыбакоў. — Гэта ўжо будзе не па партах і чыгункі, гэта будуць ужо іншыя напрамкі. Мы цяпер працуем па розных кірунках».

Што датычыцца выгады ад дыверсіфікацыі паставак нафты, старшыня канцэрна заўважыў: «Ёсць добры прынцып не складваць усе яйкі ў адзін кошык. Таму выгада мае комплексны падыход. Пры комплексным падыходзе ты недзе можаш губляць, недзе знаходзіць, але сумарны эфект атрымліваеш станоўчы».

Што датычыцца перамоў з расійскім бокам, то яны працягваюцца як на ўзроўні кампаній, так і на ўзроўні Міністэрства энергетыкі Расійскай Федэрацыі і канцэрна «Белнафтахім». «Безумоўна, мы чакаем, што перагаворныя працэсы ў найбліжэйшы час працягнуцца і на вышэйшым узроўні», — дадаў Андрэй Рыбакоў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

❍ У тэму

На пачатку года канцэрн «Белнафтахім» паведамляў, што кошт нафты для беларускіх НПЗ з улікам падатковага манеўру ў РФ вырасце ў 2020 годзе больш чым на $20 за 1 т, што складае 5 % да ўзроўню цаны 2019 года. У папярэднія гады цэны на паліва на ўнутраным рынку стрымліваліся, у выніку гэтага НПЗ былі вымушаныя нарасціць крэдытную запазычанасць, што пагоршыла фінансавы стан. У 2018 годзе было пачата выраўноўванне цэнавай сітуацыі на ўнутраным рынку, якое паступова дазволіла НПЗ выйсці на эфектыўную работу. Пры гэтым беларускія цэны на маторнае паліва застаюцца на 30-40 % ніжэйшыя, чым на сумежных еўрапейскіх і ўкраінскім рынках.

Беларускія НПЗ сістэмна павышаюць эфектыўнасць і зніжаюць затраты на вытворчасць за кошт мадэрнізацыі і рэканструкцыі тэхналагічных аб'ектаў, паведамляў канцэрн. Эканамічны эфект ад рэалізацыі мерапрыемстваў па зніжэнні выдаткаў за 2019 год «Белнафтахім» ацаніў у $60 млн.

Цэны на аўтамабільнае паліва канцэрн павышае паэтапна. «За 2019 год цэны на маторнае паліва ў рэспубліцы ў сярэднім былі павялічаныя на 13 %, у той час як сусветная каціроўка нафты за названы перыяд вырасла на 17 %», — звярталі ўвагу ў канцэрне.

Апошняе змяненне цэн на бензін (трэцяе з пачатку года) адбылося ў Беларусі 19 студзеня. Цана АІ-92-К5-Еўра склала 1,67 рубля, АІ-95-К5-Еўра — 1,77 рубля, АІ-98-К5-Еўра — 1,99 рубля, ДП — 1, 77 рубля.

«Космас — гэта лакмусавая паперка, якая дапамагае ацаніць магчымасці і здольнасці дзяржавы і народа»

Стаўка на развіццё высокіх тэхналогій і космасу ў прыватнасці — прыярытэт для нашай краіны, якая не валодае значнымі прыроднымі рэсурсамі. *«Беларусь заўсёды зарабляла за кошт мазгоў і рук людзей, за кошт кампетэнцый і кваліфікацыі нашых людзей»*, — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з генеральным дырэктарам расійскай Дзяржаўнай карпарацыі па касмічнай дзейнасці «Раскосмас» Дзмітрыем Рагозіным.

Кіраўнік краіны і дырэктар карпарацыі абмяркоўвалі магчымасці ўдзелу Беларусі ў касмічнай праграме «Раскосмасу» і іншыя кірункі сумеснай работы ў галіне. Установа цесна супрацоўнічае з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і шматлікімі прадпрыемствамі, сярод якіх «Пеленг», «Інтэграл».

«Шмат было задумак, многія рэалізаваны. Мы ведаем, і вы лепш за мяне ведаеце, што лятае на арбіце, што належыць Беларусі там. ***Мы робім не тое што першыя крокі ў космасе, а робім магчымыя крокі ў космасе»***, — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да суразмоўца.

Асваенне космасу, безумоўна, рэч дарагая, але, па словах Прэзідэнта, — прыярытэтная для нашай краіны, як і іншыя высокатэхналагічныя праекты. Космас, атамная энергетыка — вядучую ролю ў рэалізацыі гэтых праграм адыгрывае падтрымка Расіі. «Мы ў Беларусі стараемся высокія тэхналогіі развіваць па ўсіх кірунках», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. «Космас — гэта лакмусавая паперка, якая дапамагае ацаніць магчымасці і здольнасці дзяржавы і народа», — заўважыў ён.

У знак падзякі за супрацоўніцтва Дзмітрый Рагозін прэзентаваў Прэзідэнту Беларусі пальчатку касманаўта, які ў 2019 годзе пабываў у космасе. З чыёй рукі гэты «касмічны» падарунак, ён публічна не прызнаўся, каб іншыя касманаўты не раўнавалі. «Гэта першы ў мяне такі легендарны падарунак», — падзякаваў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

❍ Каментарый у тэму

Сярод асноўных партнёраў расійскай карпарацыі ў Беларусі Дзмітрый Рагозін назваў «Пеленг», які стварае ўнікальную мэтавую апаратуру для шэрагу касмічных апаратаў. «У гэтым плане расійска-беларускае супрацоўніцтва, калі б яно было больш цеснае (і Аляксандр Рыгоравіч пацвердзіў волю беларускай дзяржавы працаваць так), дазволіла б стварыць цэлую серыю апаратаў у рамках групоўкі дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі з выкарыстаннем беларускай аптычнай апаратуры», — заявіў генеральны дырэктар «Раскосмасу». Адзначыў ён і яшчэ адно беларускае прадпрыемства — лідара ў мікраэлектроніцы савецкіх часоў «Інтэграл». Праектаванне электроннай, радыяцыйна трывалай кампанентнай базы для касмічнага прызначэння — вельмі сур'ёзны кірунак для супрацоўніцтва.

«Канешне, вельмі хацелася б зрабіць сумесны апарат, вельмі хацелася б адправіць і касманаўта Рэспублікі Беларусь у будучыні, але сёння мы пачынаем маштабнае супрацоўніцтва. Раней ішлі перагаворы пра магчымую куплю беларускіх прадпрыемстваў расійскімі інтэгравanымі структурамі. Я лічу, што гэта не зусім слушны шлях, — сказаў Дзмітрый Рагозін. — Цяпер мы гаворым не пра набыццё адно ў аднаго якіхсьці актываў, а пра складанне гэтых актываў у рамках сумесных прадпрыемстваў і інтэграваных структур».

▸ ДАВЕДКА

Беларускі касмічны апарат і расійскі касмічны апарат дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі «Канопус-В» № 1 складаюць сумесную арбітальную групоўку. Мэты касмічнага праекта досыць зямныя — маніторынг тэхнагенных і прыродных надзвычайных сітуацый, кантроль за землекарыстаннем, лясным фондам, нафтагазавымі аб'ектамі і экалогіяй. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі і Дзяржаўная карпарацыя па касмічнай дзейнасці «Раскосмас» у найбліжэйшыя дні падпішуць пагадненне аб пашырэнні магчымасцяў сумеснай арбітальнай групоўкі з выкарыстаннем расійскіх касмічных апаратаў.

З 22 да 23 студзеня ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбудзецца першае пасяджэнне Міждзяржаўнага савета па космасе Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Удзельнічаць будуць дэлегацыі Расіі, Арменіі і Казахстана. На парадку сустрэчы — пытанні па інтэграцыі наземных інфраструктур, якія выкарыстоўваюць сігналы сістэмы ГЛАНАСС, рэалізацыі сумесных праектаў у галіне выкарыстання касмічнай прасторы ў мірных мэтах.

Чаму даўжэй ідуць пасылкі з-за мяжы?

У «Белпошце» тлумачаць гэта азіяцкім ажыятажам

Беларусам даводзіцца даўжэй чакаць міжнародныя пасылкі, таму што работнікі пошты павінны апрацоўваць вялікі аб'ём адпраўленняў з Кітая і Сінгапура.

«У студзені ў Беларусь у вялікіх аб'ёмах стала паступаць пошта з Кітая і Сінгапура, якая назбіралася з лістапада 2019-га ў транзітным аэрапорце Стамбула (Турцыя), — растлумачылі ў прэс-службе «Белпошты». — Гэта прывяло да таго, што аб'ём павялічыўся больш чым у 2,3 раза. У сваю чаргу, стварылася дадатковая незапланаваная нагрузка ва ўстановах міжнароднага паштовага абмену Мінска».

Акрамя таго, традыцыйна перад навагоднімі і калядным святамі патокі пошты, якая прыходзіць у Беларусь, павялічваюцца на 30—40 %. Ведаючы гэта, кампанія прыцягвае дадатковых супрацоўнікаў для апрацоўкі міжнародных пасылак, а з 2020 года — персанал з афармленнем тэрміновых працоўных дагавораў з поўнай або частковай занятасцю. «Цяпер штат дадатковых работнікаў пад прагнозныя аб'ёмы пошты цалкам укамплектаваны», — падкрэслілі на прадпрыемстве.

«Белпошта» прымае ўсе меры, каб скараціць тэрміны апрацоўкі пасылак, і просіць з разуменнем паставіцца да сітуацыі, дадалі ў прэс-службе.

Паводле БелТА.

Навацыі

ХОД ПА ДЫЯГАНАЛІ

У цэнтры Гомеля адну з галоўных вуліц пешаходы цяпер змогуць перасякаць нязвыклым спосабам. У абласным цэнтры з'явіўся дыяганальны пешаходны пераход. Гэта першы падобны вопыт у рэгіёне.

Ініцыявала новаўвядзенне ўпраўленне ДАІ Гомельскага аблвыканкама. Яго супрацоўнікі загадзя апавясцілі гамяльчан пра абмежаванне руху на гэтым участку, а дарожныя службы нанеслі адпаведную разметку напрамкаў для пешаходаў.

Дзве «зебры» па дыяганалі звязалі скрыжаванне вуліц Савецкай, Камунараў і Ланге. Цяпер перайсці праезную частку з аднаго боку на другі стане нязвыкла, але значна хутчэй. Тут дадаткова ўсталявалі чатыры святлафоры для пешаходаў. Для бяспекі ўдзельнікаў дарожнага руху яны будуць працаваць 24/7.

Асноўны плюс новаўвядзення — падобная арганізацыя патоку транспарту і грамадзян, што перасякаюць ажыўленае скрыжаванне, знізіць колькасць ДТЗ з удзелам пешаходаў, адзначылі ў ДАІ Гомельскай вобласці.

Падобныя эксперыментальныя пешаходныя пераходы могуць хутка з'явіцца і на іншых вуліцах з інтэнсіўнымі транспартнымі патокамі. Прычым дыяганальныя «зебры» актуальныя не толькі для Гомеля, але і для райцэнтраў рэгіёна.

Што датычыцца самай доўгай вуліцы Гомеля — Савецкай, то многія гараджане чакалі змен у арганізацыі руху на гэтым маршруце яшчэ пасля рэзананснай трагедыі, якая здарылася летась у кастрычніку. Нагадаем, тады 21-гадовы кіроўца BMW 740 на велізарнай хуткасці выехаў на тратуар, урэзаўся ў слуп і здзейсніў наезд на трох жанчын-пешаходаў. Адна з іх загінула, другая атрымала цяжкія цялесныя пашкоджанні, трэцяя перажыла моцны шок. Цяпер па Савецкай можна рухацца з хуткасцю да 50 кіламетраў ў гадзіну.

Наталля НЕВЯРОЎСКАЯ.

Ну і ну!

МАЛЫЯ ДЗЕТКІ — МАЛЫЯ БЕДКІ...

Слоік і бутэлька ляцелі ў аўто... А ва ўнітаз — петарда

Аператыўнікі Першамайскага РУУС Мінска ўстанавілі асобу маладога чалавека, які з хуліганскіх памкненняў разбіў лабавое шкло ў чужым аўтамабілі.

Уласнік Audi паведаміў праваахоўнікам, што ў яго машыне пабіта лабавое шкло. Транспартны сродак быў прыпаркаваны на стаянцы каля жылога дома па вуліцы Шугаева без парушэння правілаў паркоўкі.

Сышчыкі высветлілі, што аўтамабіль пашкодзіў 21-гадовы непрацуючы жыхар сталіцы. Малады чалавек жыве ў адным доме з гаспадаром пашкоджанай іншамаркі. У яго гасцявалі сябры, яны разам выпівалі. Пасля чаго мінчанін вырашыў прадэманстраваць таварышам сваю сілу — выкінуў слоік з агуркамі з акна, ды так, каб той праляцеў як мага далей, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама. Закатка звалілася на прыпаркаваны аўтамабіль. Гаспадар ацаніў прычыненую шкоду ў 2000 рублёў.

Аналагічны выпадак адбыўся нядаўна і ў Гродне. Жыхар абласнога цэнтра выявіў, што яго «Опель» пашкоджаны прадметам, выкінутым з акна шматпавярхоўкі. Іншамарка стаяла ў двары жылога дома па вуліцы Брыкеля, зноў жа, без парушэнняў правілаў дарожнага руху.

Было ўстаноўлена, што каля 22 гадзін з акна не менш чым пятага паверха пенсіянерка выкінула шкляную бутэльку. Яна ўпала за лічаныя сантыметры ад транспартнага сродку, разбілася аб асфальт, аднак асколкамі пашкодзіла лакафарбавае пакрыццё «Опеля». Шкода, прычыненая ўладальніку машыны, склала 300 рублёў.

Ужыванне спіртных напояў зноў стала ўскоснай прычынай хуліганскіх дзеянняў — гэтым разам у поле зроку праваахоўнікаў трапіў раней не судзімы жыхар Мастоўскага раёна 1995 года нараджэння. Малады чалавек адпачываў у адной з забаўляльных устаноў райцэнтра і менавіта тут здзейсніў непрыгожы ўчынак, якому ўжо дадзена прававая ацэнка. Ноччу хлопец зайшоў у санвузел кавярні, дзе кінуў ва ўнітаз петарду. Ад выбуху той разляцеўся на кавалкі, і страціў сваё функцыянальнае прызначэнне, паведамляе УУС Гродзенскага аблвыканкама.

Тое, што адбылося з сантэхнікай, гаспадары забаўляльнай установы выявілі перад яе закрыццём. Асобу хулігана ўдалося ўстанавіць па камерах відэаназірання. Сума нанесенай шкоды — адна тысяча рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Выдаткі на бяспеку форуму ў Давосе ацанілі ў $46,5 млн

Бяспека Сусветнага эканамічнага форуму (СЭФ), які праходзіць у Давосе з 21 да 24 студзеня, абыдзецца ў 45 мільёнаў швейцарскіх франкаў ($46,5 млн). Пра гэта паведамілі навінавы партал SWI Swissinfo-ch і тэлеканал SRF. Сам СЭФ аплачвае толькі невялікую фіксаваную суму, а асноўная частка выдаткаў фактычна кладзецца на швейцарскія кантоны. У ахове форуму ўдзельнічаюць падраздзяленні швейцарскіх узброеных сіл, якія адказваюць за агульную бяспеку. Ваенна-паветраныя сілы Швейцарыі заступілі на дзяжурства па пастаянным маніторынгу сітуацыі ў паветранай прасторы краіны, паведаміла міністэрства абароны. У ведамстве ўдакладнілі, што бяспека будзе забяспечвацца радарнымі ўстаноўкамі, звёнамі знішчальнікаў і наземнымі часцямі СПА. У гадзіны работы канферэнцыі самалёты ВПС Швейцарыі будуць пастаянна патруляваць прастору, паветраны трафік у раёне Давоса будзе сур'ёзна абмежаваны. Любыя палёты будуць здзяйсняцца толькі з дазволу ўлад. Па рашэнні парламента ў забеспячэнні бяспекі форуму задзейнічана не больш за пяць тысяч вайскоўцаў. Акрамя таго, у Давос на ўзмацненне накіраваны супрацоўнікі праваахоўных органаў з усёй Швейцарыі.

Экс-кіраўніка Інтэрпола прыгаварылі да 13 гадоў турмы

Кітайскі суд у Цяньцзіні вынес абвінаваўчы прысуд за карупцыю колішняму кіраўніку Інтэрпола, былому намесніку міністра грамадскай бяспекі Кітая Мэн Хунвэю ў выглядзе 13,5 года турмы. Пра гэта паведаміла Reuters. Хунвэя таксама аштрафавалі на 2 мільёны юаняў (прыблізна $290 тыс.), дадае газета South China Morning Post. Па звестках выдання, ён не мае намеру абскардзіць прысуд. Абвінавачванні на адрас Хунвэя звязаныя з 2005—2007 гадамі, калі ён працаваў намеснікам міністра грамадскай бяспекі Кітая і кіраваў марской паліцыяй. Яго прызналі вінаватым у атрыманні хабару на агульную суму 14,46 мільёна юаняў (прыблізна $2 млн). Інтэрпол паведаміў аб адстаўцы Мэна Хунвэя з пасады кіраўніка арганізацыі ў кастрычніку 2018 года. За некалькі дзён да гэтага яго жонка звярнулася ў паліцыю з заявай аб знікненні мужа падчас паездкі ў Кітай. Пазней South China Morning Post паведаміла, што Хунвэй быў затрыманы і знаходзіцца пад следствам. Новым кіраўніком Інтэрпола стаў Кім Ёнг Ян з Паўднёвай Карэі.

У Брытаніі выпусцілі манету ў гонар гурта Queen

Яна першая ў серыі, прысвечанай легендарным музыкантам і музычным калектывам, якую плануе выпусціць Каралеўскі манетны двор Брытаніі. На манеце адлюстраваныя лагатып рок-гурта і музычныя інструменты чатырох членаў Queen: электрагітара Red Special Браяна Мэя, барабан Роджэра Тэйлара, бас-гітара Джона Дзікана і мікрафон Фрэдзі Мэрк'юры. Таксама размешчана выява клавіятуры раяля — на ёй націснутыя тры клавішы, якія адпавядаюць першаму акорду адной з самых вядомых кампазіцый гурта — Bohemian Rhapsody. Як адзначылі прадстаўнікі Каралеўскага манетнага двара, гэта першая памятная манета ў Брытаніі, выпушчаная ў гонар музычнай групы.

Крымінал

МОРА БРАГІ Ў АСТРАЎЦЫ І СВІСЛАЧЫ

У першым выпадку канфіскавана звыш 1000 літраў, у другім — звыш 2000, паведамляе МУС.

Супрацоўнікі міліцыі Астравецкага РАУС праводзілі рэйдавыя мерапрыемствы сумесна з вайскоўцамі в/ч 2044. На адлегласці кіламетра ўглыб лесу каля хутара Літвяны былі выяўлены металічныя ёмістасці, у якіх знаходзілася брага. У ходзе замераў было ўстаноўлена, што нелегальны вытворца захоўваў яе ў аб'ёме 1272 літры. Таксама на месцы былі знойдзеныя часткі самагоннага апарата.

Падобны выпадак адбыўся і ў Свіслацкім раёне. Міліцыянеры райаддзела праводзілі рэйдавыя мерапрыемствы. У ходзе іх у нацыянальным парку «Белавежская пушча» паблізу вёскі Студзенікі быў знойдзены самагонны апарат і 2210 літраў брагі.

І ў першым, і ў другім выпадках міліцыянеры ўстанаўліваюць асобы падазраваных у здзяйсненні адміністрацыйнага правапарушэння.

За падобныя дзеянні прадугледжана адказнасць па артыкуле 12.43 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь — «Выраб або набыццё моцных алкагольных напояў (самагону), паўфабрыкатаў для іх вырабу (брагі), захоўванне апаратаў для іх вырабу». Санкцыі артыкула цягнуць папярэджанне або накладанне штрафу ў памеры да пяці базавых велічынь з канфіскацыяй указаных напояў, паўфабрыкатаў і апаратаў. За паўторнае правапарушэнне на працягу года памер штрафу можа дасягнуць трыццаці базавых велічынь.

РАЗГРАМІЎ РЭСТАРАН,

а таксама пашкодзіў аўтамабілі

Не менш за 3,5 тысячы рублёў шкоды і крымінальная справа за хуліганства — такі вынік начной прыгоды 18-гадовага юнака ў Віцебску.

Студэнт-трэцякурснік распіваў моцныя спіртныя напоі ў кампаніі сваіх знаёмых. Як доўга працягвалася застолле і што падштурхнула яго да некантраляванай агрэсіі, ён успомніць не можа, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама. Першымі на сабе «адчулі» гнеў маладога чалавека дзве іншамаркі, прыпаркаваныя ў адным з двароў. Затым праз службовы ўваход ён трапіў у рэстаран, у які ўжо прыйшлі першыя работнікі. Адна з іх паспрабавала самастойна выправадзіць няпрошанага наведвальніка, але віцяблянін пачаў граміць кухню ўстановы. Ён разбіў аб падлогу касавы апарат і вагі, а таксама пашкодзіў бытавую тэхніку і шклопакет, перавярнуў некалькі сталоў. Уцехамірыць студэнта атрымалася толькі прыбылым праваахоўнікам. Агляд паказаў, што ў выдыханым паветры падазраванага змяшчаецца два праміле алкаголю. Па факце хуліганства распачата крымінальная справа.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НОВАЕ Ў ПРАФЕСІЙНЫМ ПЕНСІЙНЫМ СТРАХАВАННІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Але высветлілася, што з-за невялікага перыяду і сум адлічэнняў назапашаная пенсія ў такіх людзей аказалася вельмі нізкая.

Вось як тлумачыць гэтую сітуацыю на сайце Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі намеснік старшыні ФПБ Алена Манкевіч: «Напрыклад, трактарыст-машыніст ва ўзросце 48 гадоў працуе ў сельскагаспадарчым прадпрыемстве. На 1 студзеня 2009 года яго стаж складае 13 гадоў, а пасля 1 студзеня — 9 гадоў і 7 месяцаў. Атрымліваецца, што калі мужчына хацеў атрымліваць датэрміновую пенсію па старых правілах, ён ужо у 2019 годзе павінен быў адмовіцца ад сваёй работы (каб не перавысіць планку ў 10 гадоў стажу). Калі ён усё ж вырашыў застацца, а на пенсію выйсці ў 58 гадоў, то выплаты яму разлічаць толькі па новых правілах (стаж пасля 1 студзеня 2009 года акажацца большы за 10 гадоў). Пры гэтым мужчына не зможа працаваць на ранейшай пазіцыі, а памер выплат, тобок датэрміновая пенсія за асаблівыя ўмовы працы, складзе 40—60 рублёў у месяц. Хутчэй за ўсё, афармляць датэрміновую пенсію дзеля такіх грошай трактарыст не будзе і яму нічога не застанецца, як чакаць дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту».

У такую пенсійную пастку трапіла каля 20 тысяч чалавек, палова з якіх занятыя ў сельскай гаспадарцы. Але праблема закранае і работнікаў лёгкай прамысловасці, гарадскога транспарту, авіяцыі і іншых.

Таму быў прыняты Указ № 15, які дае права чалавеку, што напрацаваў не менш за палову стажу да 2009 года, вярнуцца ў старую пенсійную сістэму. І ён зможа атрымліваць пенсію, працягваючы працаваць, напрыклад, трактарыстам, у памеры пенсіі па ўзросце.

У 2021 годзе да атрымання прафесійнай пенсіі падыдуць медыцынскія і педагагічныя работнікі. У адпаведнасці з новым указам яны таксама змогуць вярнуцца ў звычайную пенсійную сістэму.

Як адзначыла ў інтэрв'ю праграме «Галоўны эфір» на канале «Беларусь 1» міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ, летась у асаблівых умовах працы ў нашай краіне працавала каля 350 тысяч чалавек. Больш за ўсё сярод іх налічваецца медыцынскіх і педагагічных работнікаў (больш за 150 тысяч), далей ідуць тыя, хто працуе ў асабліва шкодных і шкодных умовах (120 тысяч), трактарысты (34 тысячы), даяркі і жывёлаводы (30 тысяч), кіроўцы гарадскога і пасажырскага транспарту (больш за 10 тысяч). Пры гэтым, як адзначыла міністр, у параўнанні з 2009-2010 гадамі колькасць рабочых месцаў з асаблівымі ўмовамі працы скарацілася на 30 %.

Іншыя новаўвядзенні ўказа

Згодна з дадзеным указам, таксама будуць павышаны больш чым у два разы тарыфы ўзносаў для работадаўцаў на прафесійнае пенсійнае страхаванне работнікаў, занятых на работах з асаблівымі ўмовамі працы або асобнымі відамі прафесійнай дзейнасці. Гэтае новаўвядзенне ўвойдзе ў сілу з 1 студзеня 2021 года.

Спецыялісты адзначаюць, што яно дасць магчымасць павысіць гарантыі годнай пенсіі і ўзровень датэрміновых ільготных пенсій грамадзян з вялікім стажам працы ў неспрыяльных умовах, а таксама забяспечыць фарміраванне ў далейшым больш высокіх памераў пенсійных выплат у сістэме прафесійнага пенсійнага страхавання.

У цэлым, як адзначаюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, указ пашырае пераходны перыяд, але не прыводзіць да прыпынення дзеяння сістэмы прафесійнага пенсійнага страхавання. Асобы, у якіх да 1 студзеня 2009 года сфарміраваны нязначны спецыяльны стаж, будуць у далейшым афармляць пенсію па правілах прафесійнага пенсійнага страхавання.

Як можна будзе выкарыстаць прафесійныя пенсійныя накапленні

Работнікі, пенсіі якіх будуць разлічвацца па правілах прафесійнага пенсійнага страхавання, будуць мець права на тры варыянты выкарыстання прафесійных пенсійных накапленняў.

Першы варыянт — фарміраванне датэрміновай прафесійнай пенсіі. Работадаўца будзе выплачваць за гэтага работніка абавязковыя ўзносы на прафесійнае пенсійнае страхаванне ў дзяржаўны пазабюджэтны фонд сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН), з якіх пасля будзе выплачвацца датэрміновая пенсія, а затым, калі работнік дасягне агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, ён будзе атрымліваць ужо агульнаўстаноўленую пенсію.

Другі варыянт — работнік можа выбраць замест датэрміновай прафесійнай пенсіі дадатковую прафесійную пенсію. Яна будзе прызначацца пасля дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту і раўняцца памеру БПМ. Атрымліваць асноўную і дадатковую пенсіі можна будзе столькі гадоў, на колькі назапашана пенсійных зберажэнняў дадаткова да пенсіі па ўзросце.

І трэці варыянт, згодна з якім работнік можа адмовіцца ад датэрміновай і дадатковай пенсій, а замест гэтага атрымліваць штомесячную даплату да зарплаты, памер якой вызначаецца работадаўцам, але не можа быць меншы за суму ўзносу на прафесійнае пенсійнае страхаванне за гэтага работніка. Гэта значыць, такія ўзносы не будуць назапашвацца, а замест таго выплачвацца самому работніку як прыбаўка да заработнай платы.

Святлана БУСЬКО.

МЕРСЕДЭС, ЛУНА, ТАМЕРЛАН, МАРС...

Беларусы ўсё часцей называюць дзяцей унікальнымі імёнамі

Летась у краіне нарадзілася больш за 88 тысяч немаўлят. Лідарамі ў гэтай справе сталі сталіца — тут зарэгістравана звыш 19 тысяч актаў аб нараджэнні, Брэсцкая вобласць — больш за 14,1 тысячы, Гомельская — 13,4 тысячы і Мінская — 12,6 тысячы. У «топавую» дзясятку імёнаў краіны ўвайшлі Максім, Арцём, Міхаіл, Аляксандр, Мацвей, Сафія, Ганна, Марыя, Ксенія, Настасся.

Рэдкім імёнам беларусы аддаюць перавагу ў сталіцы (у Мінску заключаецца больш за ўсё інтэрнацыянальных шлюбаў) і абласных цэнтрах, прычым найчасцей даць унікальнае імя бацькі імкнуцца дзяўчынкам. Прынамсі, у Мінску імёны 180 хлопчыкаў і 251 дзяўчынкі цягам года не паўтарыліся, — расказала **Вольга ШЫБКО, прэс-сакратар Міністэрства юстыцыі Беларусі.** — Так з'явіліся сталічныя Асоль, Венера, Джэніфер, Лёля, Рагнеда, Фадзей, Оскар, Дабрамір, Іў, Вітаўт.

Іншыя рэгіёны таксама не застаюцца ўбаку ад моды на непаўторнасць. У краіне цяпер жывуць дзяўчынкі Мерседэс, Германіка, Айсель, Весяліна, Златаславія, Мілэдзі, Дабраміла, Эльза, Аян, Ясна, Луна, Лея, Вірсавія, Лазарына, Любава, Ясміна, Сімона, Сена, Фёкла, Эліс, Юнона, Ядвіга. З хлопчыкаў пахваліцца незвычайнымі імёнамі могуць Геральд, Філат, Саламон, Тамерлан, Франц, Марс, Каміль, Аўтандзіл, Мейліс, Тадэвуш, Фама, Марцін, Лявонцій.

Дзіцяці ў Беларусі можна даць не больш за два імені, якія не супярэчаць нормам маралі. Галоўным будзе лічыцца тое, што запісана ў акце аб нараджэнні першым.

Ірына СІДАРОК.

Кардыёлагі і тэрапеўты ў адной суполцы

Беларускае таварыства кардыёлагаў і тэрапеўтаў зарэгістравана Міністэрствам юстыцыі краіны. Арганізацыя аб'ядноўвае спецыялістаў галіны аховы здароўя, якія займаюцца навуковадаследчай, педагагічнай і практычнай дзейнасцю, удасканальваюць метады дыягностыкі і лячэння, укараняюць у практыку найноўшы вопыт і дасягненні кардыялогіі і тэрапіі.

Старшыня суполкі, прафесар, урач вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі па тэрапіі, вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі па кардыялогіі, загадчык кафедры сталічнага медыцынскага ўніверсітэта Наталля МІЦЬКОЎСКАЯ адзначае:

— За апошнія 11 гадоў мы правялі каля 40 мерапрыемстваў рэспубліканскага і міжнароднага значэння, у тым ліку два кангрэсы кардыёлагаў і тэрапеўтаў. Ідэя аб'яднаць спецыялістаў розных профіляў нарэшце запатрабавала стварэння такога аб'яднання. Гэта дапаможа падрыхтаваць больш сур'ёзную платформу для падобных мерапрыемстваў, а таксама — актыўней уцягваць у работу ўрачоў з адпаведным вопытам з рэгіёнаў і з-за мяжы.

Ірына СІДАРОК.

ПРЫСВОІЛІ ЗНОЙДЗЕНУЮ ДЗІЧЫНУ

І сталі фігурантамі крымінальнай справы

Двое жыхароў Пружанскага раёна не займаліся незаконным паляваннем, але адкажуць за браканьерства.

Як паведамілі ў МУС, інспектары прыродааховы ўвечары на трасе сустрэлі мужчыну з нажом і ў акрываўленай вопратцы. Калі яго спыталі, што адбылося, ён пачаў блытана расказваць, што, маўляў, па просьбе знаёмых разбіраў цяля на суседняй ферме. Памагатаму не паверылі і для далейшых разбораў выклікалі міліцыю.

Праваахоўнікі высветлілі, што жонка затрыманага ехала дадому і стала сведкай ДТЗ: недалёка ад вёскі аўтамабіль збіў лася, які выбег на дарогу. Жывёла загінула. Дабраўшыся дадому, жанчына расказала пра здарэнне мужу.

Не жадаючы адмовіцца ад бясплатнай дзічыны, мужчына папрасіў суседа з мотаблокам дапамагчы з транспарціроўкай жывёлы. На месцы аварыі яны разабралі тушу, сусед павёз здабычу ў вёску, а арганізатар «аперацыі» пайшоў дадому пешшу і папаўся інспектарам. Заведзена крымінальная справа.

Сяргей РАСОЛЬКА.



Я не з гэтай зімы. Не.
Я адтуль, дзе снягі паляглі, —
Там мароз маляваў на шкле,
Зіхацелі ільдзінкі ў галлі.
Снег у той незваротны час
Самы чысты і светлы быў,
Як матулін ручнік на абраз,
Я той снег не забыў. Не забыў...
У хаўрусе слаты і смугі,
У дажджах, што заміж маразоў,
Успаміны пра тыя снягі
Саграваюць мяне зноў і зноў.
Можа, людзі забудуць зіму,
Цеплыня, нібы рай, ахіне —
Але ж я і тады паўтару:
Я не з гэтага раю. Не.

На канюшню пяць разоў на тыдзень

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Да свайго юбілею школа атрымала выдатны падарунак — капітальны рамонт. Ён пачаўся паўтара года таму. За гэты час адбыліся прыемныя змены: былі адрамантаваныя і ўцепленыя канюшні, а таксама адміністрацыйныя будынкі, цалкам змянілі манеж, замянілі стары дах і вокны, усталявалі трыбуну для гледачоў. Дзецям і трэнерам стала камфортна тут працаваць не толькі ў цёплы час года, калі заняткі можна праводзіць на вуліцы.

Зазірнуўшы ў школу коннага спорту ў абед, мы трапілі ў самы разгар трэніровак — цяпер настаўнікі рыхтуюць сваіх вучняў да дзіцячых рэспубліканскіх спаборніцтваў. Хтосьці адпрацоўвае тэхніку выездкі ў манежы, хтосьці яшчэ толькі рыхтуе коней да трэніроўкі, а 9-гадовы Кірыл Ляўчонак назірае за трэніроўкай сястры з трыбуны, таму што яго заняткі ўжо скончыліся. «Я прыйшоў у гэтую школу проста таму, што мне падабаюцца коні, займаюся амаль год, — расказвае хлопчык. — Ужо ўмею скакаць галопам і рыссю, рабіць важныя рухі на кані — навучыцца гэтаму было няпроста. Мне яшчэ трэба будзе працаваць над тым, каб упэўнена трымацца ў сядле». Кірыл са сваёй сястрой Машай прыязджаюць на трэніроўкі ў Зазер'е з суседняй вёскі Седча, шлях да школы яны звычайна пераадольваюць на роварах. Пакуль Маша разам з іх любімым канём Эмай адпрацоўвае рухі, Кірыл захоплена апавядае, як праводзіць час на канюшні, і дзеліцца сваёй марай — стаць ветэрынарам. «Дарэчы, наш старэйшы брат таксама займаецца конным спортам тут ужо гадоў 10, цяпер яму 18, і ён часта прывозіць дадому кубкі і медалі са спаборніцтваў».

Набор дзяцей у групы пачатковай падрыхтоўкі трэнеры школы пачынаюць ва ўзросце ад 9 да 12 гадоў. З кожным годам тэхналогіі развіваюцца ўсё хутчэй, таму прыцягнуць дзяцей да коннага спорту становіцца ўсё больш складана, адзначае **трэнер Ганна ТУШЫНСКАЯ.** «Я выраслa ў гэтай школе, упершыню села на каня ў шасцігадовым узросце і выдатна памятаю, якія натоўпы дзяцей тады былі ў канюшні. Цяпер са скрыпам магу набраць 10-11 чалавек, з іх застанецца ў спорце дзесьці адно дзіця. Калі два, гэта ўжо шчасце для трэнера». Ганна Уладзіміраўна кажа, што на першых трэніроўках складана зразумець, ці ёсць у дзіцяці схільнасць да коннага спорту, — гэта выяўляецца з часам. Першапачаткова галоўнае, каб былі здароўе і любоў да жывёл. «Часам бацькі прыводзяць дзіця са словамі: «Ён хворы на конны спорт». Але адна справа зайсці ў канюшню і проста пагладзіць коніка, а іншая сесці на яго, навучыцца даглядаць і працаваць у манежы, выконваючы патрабаванні трэнера. Часта такая хвароба хутка праходзіць».

Як ні дзіўна, большасць дзяцей, якія тут займаюцца, не з Зазер'я, яны прыязджаюць з суседніх вёсак альбо з Мінска. Таксама ў мясцовай ДЮСШ займаюцца дзеці з Асіповіч, Дружнага, Свіслачы, Рудзенска і Міханавіч. «Часта тыя

Ганна ТУШЫНСКАЯ.

дзеці, якія не праходзяць адбор у Ратамцы, прыязджаюць да нас, а мы рады кожнаму», — тлумачыць **дырэктар школы Алена ШАЎЧЭНКА.**

Дабрацца з Мінска да Зазер'я можна маршруткай, але ў зімовы час у іх раскладзе бываюць збоі, таму часта каму-небудзь з бацькоў даводзіцца прывозіць на ўласнай машыне адразу некалькі дзяцей, але іх гэта не пужае. «Я ваджу сюды сваю дачку ўжо пяты год, — расказвае **Іна ВОЎЧАК.** — Без коней яна ўжо нікуды, таму мы пяць разоў на тыдзень на канюшні. Была б магчымасць займацца больш, прыязджалі б і часцей. Вельмі задаволеныя, што ў школе нарэшце зрабілі рамонт, дах, таму што раней дзеці займаліся толькі на вуліцы. Ну, як займаліся: проста прыходзілі і крочылі, таму што па гразі асабліва не пагарцуеш. Цяпер чакаем папаўнення коней, каб была магчымасць удзельнічаць у спаборніцтвах».

Дырэктар школы расказвае, што перш чым пасадзіць дзіцяці на каня, трэнеры вучаць правільным зносінам з жывёлай: «надзяваць аброць, сядло, чысціць, потым паціху займацца на кордзе».

Дарэчы, з трэнерскімі кадрамі ў Зазер'і праблем няма, тут працуюць шэсць настаўнікаў, некаторыя — выхаванцы гэтай жа школы. «Усе трэнеры мясцовыя, нават тыя, хто раней лічыўся прыезджы, цяпер абзавёўся жыллём бліжэй да канюшні. Гэтая работа зацягвае — нездарма ж кажуць, што былых коннікаў не бывае», — кажа Ганна Тушынская, дадаючы, што не ўяўляе сваё жыццё без гэтых жывёл.

Папулярнасць коннага спорту ў краіне расце, таму з'яўляецца і больш спаборніцтваў для дзяцей, але ў школы ёсць адна вялікая праблема, не сказаць пра якую проста немагчыма. Сёння ў Зазер'і 27 коней, але, каб дзеці паказвалі добры вынік і падвышалі свой узровень, патрэбныя новыя коні — маладыя. «Лічыцца, што спартыўны конь павінен «сыходзіць на пенсію» ў 15 гадоў, — тлумачыць Ганна Уладзіміраўна. — А ў нас вы можаце ўбачыць жывёл па 22-23 гады. Вядома, што яны не могуць скакаць патрэбныя метры ў канкуры, напрыклад. Таму нашы дзеці не заўсёды займаюць высокія месцы на рэспубліканскіх спаборніцтвах. Пажадана, каб штогод у школе з'яўлялася па два-тры новыя кані. Каго прасіць аб гэтым, мы ўжо не ведаем», — са шкадаваннем адзначае трэнер.

Сёння ўтрыманне аднаго каня абыходзіцца школе ў 1700—2000 долараў у год. За станам іх здароўя пастаянна сочаць трэнеры і ветэрынарны ўрач. Дарэчы, працаваць з дзецьмі жывёла можа не адразу пасля куплі, а толькі з шасці гадоў, пасля таго як да заняткаў яе падрыхтуюць трэнеры. Зарабляць платнымі паслугамі школе ў Зазер'і складана, віной усяму не вельмі блізкае ад сталіцы размяшчэнне. Ідэю іпатэрапіі дырэктар школы не падтрымлівае. «Для таго каб займацца лячэннем з дапамогай коней, патрэбныя адмыслова падрыхтаваныя жывёлы і спецыялісты з медыцынскай адукацыяй, — тлумачыць Алена Шаўчэнка. — Я супраць таго, каб проста зарабляць на гэтым грошы».

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.
Мінск — Зазер'е — Мінск.

Гандбол

Падвялі паспешныя кідкі...

Зборная Беларусі па гандболе сёння правядзе заключны матч другога групавога этапу чэмпіянату Еўропы

У панядзелак беларускія гандбалісты саступілі зборнай Іспаніі, дзеючаму чэмпіёну Старога Свету, 28:37 і страцілі шанцы на выхад у паўфінал.

— Супраць каманды такога высокага класа нам удалося выдаць добры першы тайм. Атрымліваліся контратакі, гэта быў ключ да поспеху ў першыя 30 хвілін, — кажа **галоўны трэнер зборнай Беларусі Юрый ШАЎЦОЎ.** — Каманда Іспаніі дасведчаная і прапаноўвала нам розныя сістэмы абароны. Нейкі час наша нападзенне спраўлялася. У другім тайме іх варатар паказаў выдатную гульню. Менавіта ён здзейсніў пералом у гэтым матчы. Наша абарона была нестабільная ў другім тайме, варатары паказалі вельмі нізкі працэнт.

— Нас падвялі паспешныя кідкі і страты ў вельмі важны момант. Пасля гэтага лік стаў «мінус пяць». Іспанцы адарваліся, і мы ўжо не змаглі іх дастаць, — каментуе гулец нашай каманды **Уладзіслаў КУЛЕШ.** — Трэба працаваць над дысцыплінай, каб не рабіць неабгрунтаваных кідкоў, даводзіць атакі да лагічнага завяршэння. У нас ёсць яшчэ адна гульня.

Зборныя Іспаніі і Харватыі датэрмінова аформілі свой выхад у паўфінал. Каманда Германіі гарантавала сабе трэцяе месца ў групе і будзе змагацца за пятае месца ў турніры.

Пасля чацвёртага тура асноўнага раўнда правы крайні зборнай Беларусі Мікіта Вайлупаў займае 3-е месца ў спісе найлепшых бамбардзіраў. У яго актыве 35 галоў (73 % эфектыўнасці кідкоў). Беларускі лінейны Арцём Каралёк знаходзіцца на 5-й пазіцыі ў гэтым жа спісе. На яго рахунку 30 галоў (73 % эфектыўнасці кідкоў).

Свой заключны матч другога групавога этапу падапечныя Юрыя Шаўцова правядуць сёння супраць каманды Аўстрыі.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Изменения в проектную декларацию ООО «ДАТЧ СТАР», опубликованной в газете «Звязда» 14.12.2017 г.

«Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генплану в квартале пр-т Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» I очередь строительства, 6–11 секции, II очередь строительства, секции 1–3)» (I очередь строительства 7-й пусковой комплекс, 8-й пусковой комплекс).

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

1 (одна) однокомнатная квартира по принципу «свободной планировки» площадью 41,51 кв. м: стоимость 1 кв. метра от 1500 до 1550 долларов США;

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения».

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, дом 19, офис 860. Тел.: +375 44 53 43 000, +375 29 53 43 000.

УНП 191061436

ОАО «САНТЕХЭЛЕКТРОМОНТАЖ»

извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 3 марта 2020 г. очередного общего собрания по адресу: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8А

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2019 год и основных направлениях деятельности общества в 2020 г.
2. Отчет наблюдательного совета общества.
3. Утверждение годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2019 г.
4. Утверждение распределения прибыли общества за 2019 г. и о выплате дивидендов за 2019 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2020 году и первом квартале 2021 г.
6. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.

Место проведения собрания по месту нахождения ОАО «Сантехэлектромонтаж»: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8А.

Начало работы собрания – в 16.00.

Время регистрации участников собрания в день проведения собрания с 15.30 до 16.00. Акционеру при себе иметь паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен на основании реестра акционеров по состоянию **на 10 февраля 2020 г.**

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14.00 до 16.00, начиная с 10 февраля 2020 года по месту нахождения общества.

УНП 400052115

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«СМАРТ БОНУС 2.0»

Настоящие Правила проведения Рекламной игры «Смарт Бонус 2.0» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Смарт Бонус 2.0» (далее – Рекламная игра).

Рекламная игра «Смарт Бонус 2.0» проводится с целью стимулирования осуществления безналичных платежей, реализации розничных банковских услуг Альфа-Банка, привлечения новых клиентов посредством реализации комплекса оказываемых ЗАО «Альфа-Банк» услуг, включенных в один из Пакетов услуг Alfa Smart (далее – подключение Пакета решений Alfa Smart).

1. Организатор Рекламной игры.

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «АМК «РЭПКА», юридическое лицо согласно законодательству Республики Беларусь с местонахождением по адресу: г. Минск, 220073, ул. Ольшевского, д. 20/11, оф. 21, УНП 191728827, зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом Республики Беларусь решением от 23 августа 2012 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей.

2. Заинтересованное лицо Рекламной игры.

Заинтересованным лицом Рекламной игры является ЗАО «Альфа-Банк», 220013, г. Минск, ул. Сурганова, д. 43–47.

3. Участники Рекламной игры.

Участниками Рекламной игры могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие или пребывающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь, достигшие 18 лет (далее по тексту – Участники), открывшие в Альфа-Банке текущий (расчетный) счет, к которому выпущена банковская платежная карточка (далее – Карта).

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники и лица, находящиеся с ними в отношениях свойства, а также члены Комиссии.

4. Наименование Рекламной игры – «Смарт Бонус 2.0».

5. Территория проведения Рекламной игры

Рекламная игра «Смарт Бонус 2.0» проводится на территории Республики Беларусь.

6. Срок начала и окончания Рекламной игры

Рекламная игра проводится в период с **23 января 2020 года по 30 августа 2020 года.**

7. Состав комиссии по проведению Рекламной игры:

Для контроля за соблюдением Правил, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

Председатель комиссии: Романчик Александр Михайлович, начальник отдела маркетинга и рекламы ЗАО «Альфа-Банк».

Заместитель председателя комиссии: Воробей Владимир Сергеевич, специалист по маркетингу ООО «АМК «РЭПКА».

Прыгунова Ольга Юрьевна, специалист по маркетингу ООО «АМК «РЭПКА».

Корженок Екатерина Сергеевна, главный специалист отдела маркетинга и рекламы ЗАО «Альфа-Банк».

Мережко Анастасия Викентьевна, главный специалист отдела мониторинга комплаенс-рисков ЗАО «Альфа-Банк».

8. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Рекламной игры.

Для участия в Рекламной игре необходимо:

1. В период с 00.00 23.01.2020 по 23.59 30 апреля 2020 года:

1.1. Подтвердить свое согласие на участие в Рекламной игре при оформлении заявления на подключение к Пакету решений Alfa Smart в любом отделении ЗАО «Альфа-Банк» по короткому номеру 198 (звонок бесплатный), в мобильном приложении InSync.by или в чате мобильного приложения InSync.by.

1.2. Уплатить по подключенному Пакету решений Alfa Smart (Smart Classic, Smart Gold, Smart Platinum, Smart Black) вознаграждение за обслуживание по подключенному Пакету решений либо выполнить **один из критериев** бесплатности по соответствующему Пакету решений Alfa Smart (таблица 1).

Участникам, которые подключили Пакет решений до 22.01.2019 включительно, уплатить по подключенному Пакету решений Alfa Smart вознаграждение за обслуживание по подключенному Пакету решений либо выполнить **один из критериев** бесплатности соответствующего Пакета решений Alfa Smart (таблица 1).

Таблица 1

Пакеты решений Alfa Smart				
Критерий бесплатности	Smart Classic	Smart Gold	Smart Platinum	Smart Black
Количество транзакций, шт. за календарный месяц	15	30	-	-
Сумма транзакций по всем карточкам, бел. руб. *За календарный месяц*	250	500	1250	2500
Зачисления заработной платы, бел. руб. *Учитываются все зачисления в рамках зарплатного проекта за календарный месяц*	500	1000	2500	5000
Среднедневные остатки на счетах в течение календарного месяца, бел. руб.	500	1000	2500	5000
Среднедневные остатки по депозитам в течение календарного месяца, бел. руб.	5000	20 000	50 000	100 000
Вознаграждение за обслуживание, бел. руб.	4,9	6,9	14,9	49,9

При определении соблюдения Участником критериев бесплатности учитываются операции, транзакции, карточки Участника согласно Перечню вознаграждений, взимаемых за операции, осуществляемые ЗАО «Альфа-Банк», опубликованному на интернет-сайте Банка **(https://www.alfabank.by/about/rates/).**

При невыполнении критерия бесплатности в течение календарного месяца у Участника Рекламной игры с банковского счета списывается вознаграждение за обслуживание по подключенному Пакету решения.

2. По состоянию на 6 мая 2020 года иметь подключенный Пакет решений Alfa Smart.

3. При выполнении условий Рекламной игры Участнику за Пакет решений Alfa Smart (Smart Classic, Smart Gold, Smart Platinum, Smart Black) начисляется один шанс.

Начисленные шансы участвуют в розыгрыше следующим образом:

Участники, которые подключили Пакет решений Smart Classic участвуют в розыгрыше Приза № 1, 4.

Участники, которые подключили Пакет решений Smart Gold участвуют в розыгрыше Приза № 1, 2, 4, 5.

Участники, которые подключили Пакет решений Smart Platinum участвуют в розыгрыше Приза № 1, 2, 3, 4, 5.

Участники, которые подключили Пакет решений Smart Black участвуют в розыгрыше Приза № 1, 2, 3, 4, 5, 6.

Наличие шансов для целей розыгрыша призов анализируется на 6 мая 2019 года.

Если клиент в период с 00.00 23.01.2019 по 23.59 30 апреля 2020 года переподключается с одного Пакета решений на другой Пакет решений (т. е. отключает одни пакет, подключает другой пакет), то на дату 6 мая 2020 г. засчитывается выполнение условий игры по текущему подключенному Пакету решений.

9. Состав и размер призового фонда в белорусских рублях и источник его формирования.

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств Заинтересованного лица – Закрытого акционерного общества «Альфа-Банк».

Размер Призового фонда составляет **29 725,42 (двадцать девять тысяч семьсот двадцать пять белорусских рублей 42 копейки).**

Таблица № 1

№	Наименование	Название приза далее в Правилах	Кол-во, шт.	Цена, бел. рублей	Общая стоимость, бел. рублей
1	Подарочный сертификат «Дистанционные индивидуальные занятия по английскому языку с русскоговорящим преподавателем (4 урока)». Срок действия сертификата – 12 месяцев с момента активации	Приз 1	30	159,688	4 790,64
	Денежные средства			4,29	128,70
2	Подарочный сертификат «Дистанционные индивидуальные занятия по английскому языку с русскоговорящим преподавателем (8 уроков)». Срок действия сертификата – 12 месяцев с момента активации	Приз 2	20	292,539	5 850, 78
	Денежные средства			24,14	482,80
3	Умная колонка Yandex Station черный (YNDX 0001)	Приз 3	20	318, 00	6 360, 00
	Денежные средства			27,94	558,80
4	Коды на подписку Яндекс на 180 дней. Срок действия кода 14 месяцев с момента передачи	Приз 4	250	23,94	5 985, 00
5	Коды на подписку Яндекс на 365 дней. Срок действия кода 14 месяцев с момента передачи	Приз 5	70	39,90	2 793, 00
6	Подарочный сертификат на услуги питания в Гастро-Баре Butterbro номиналом 500 руб., срок действия сертификата – в течение 3 месяцев с даты выдачи Победителю	Приз 6	5	500, 00	2 500, 00
	Денежные средства			55,14	275,70
ИТОГО:					**29 725,42**

10. Место, дата, время и порядок розыгрыша призового фонда, порядок определения победителей Рекламной игры.

10.1. К каждому розыгрышу данные об участниках Рекламной игры и шансов каждого Участника Рекламной игры формируются Организатором в список для розыгрыша, который включает в себя: Ф. И. О. Участника Рекламной игры, мобильный телефон, номер шанса, дату уплаты комиссии за Пакет решений или дату окончания отчетного периода за который участник выполнил один из критериев бесплатности (последняя календарная дата месяца).

Для каждого розыгрыша Организатор формирует отдельный список, где присваивает каждому шансу один порядковый номер, начиная с 0000001 и выше.

Списки формируются в алфавитном порядке начиная с буквы «А», по фамилии, имени, отчеству участника.

10.2. Розыгрыши Призового фонда проводятся открыто в присутствии Комиссии в офисе ЗАО «Альфа-Банк» по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 43.

В розыгрышах принимают участие шансы, которые были получены участниками за выполнение условий участия в Рекламной игре.

Дата и время розыгрыша	Участники, которым начислены шансы по Пакетами решений Alfa Smart	Призы для розыгрыша
14 мая 2020 г. в 13.00	1. Smart Classic, Smart Gold, Smart Platinum, Smart Black	Приз № 1 – 30 штук
	2. Smart Gold, Smart Platinum, Smart Black	Приз № 2 – 20 штук
	3. Smart Platinum, Smart Black	Приз № 3 – 20 штук
	4. Smart Classic, Smart Gold, Smart Platinum, Smart Black	Приз № 4 – 250 штук
	5. Smart Gold, Smart Platinum, Smart Black	Приз № 5 – 70 штук
	6. Smart Black	Приз № 6 – 5 штук

10.3. Для проведения розыгрыша используется лототрон и 10 одинаковых непрозрачных шаров с цифрами от 0 до 9 внутри. Определение номеров Победителей происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из лототрона. Для определения первой слева цифры номера Победителя лицо, проводящее розыгрыш, помещает в лототрон шары с номерами от 0 по первую слева цифру последнего порядкового Номера Участника согласно соответствующему списку. Шары перемешиваются, из лототрона путем случайной выборки извлекается шар, номер которого определяет искомую цифру. Для определения второй и последующих цифр номера Победителя в лототрон загружаются все десять шаров. После извлечения каждого шара производится проверка на соответствие полученной комбинации цифр Номеру Участника согласно соответствующему списку. При отсутствии полученной комбинации цифр в номерах по списку извлеченный шар не возвращается в лототрон, а лицо, проводящее розыгрыш, извлекает следующий шар. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация не совпадет с Номером Участника по списку.

10.4. Процедура повторяется до определения 30 Победителей «Приза 1», 20 Победителей «Приза 2», 20 Победителей «Приза 3», 250 Победителей «Приза 4», 70 Победителей «Приза 5» и 5 Победителей «Приза 6».

10.5. Выигравшим Приз «Приз 1» в Розыгрыше считается 1 Номер Участника, определенный согласно п. 10.3., и каждый 1000-й, следующий за ним в Списке, в количестве 29 Номеров Участника. Всего 30 призов.

10.6. Выигравшим Приз «Приз 2» в Розыгрыше считается 1 Номер Участника, определенный согласно п. 10.3., и каждый 5000-й, следующий за ним в Списке, в количестве 19 Номеров Участника. Всего 20 призов.

10.7. Выигравшим Приз «Приз 3» в Розыгрыше считается 1 Номер Участника, определенный согласно п. 10.3., и каждый 5000-й, следующий за ним в Списке, в количестве 19 Номеров Участника. Всего 20 призов.

10.8. Выигравшим Приз «Приз 4» в Розыгрыше считается 1 Номер Участника, определенный согласно п. 10.3., и каждый 400-й, следующий за ним в Списке, в количестве 249 Номеров Участника. Всего 250 призов.

10.9. Выигравшим Приз «Приз 5» в Розыгрыше считается 1 Номер Участника, определенный согласно п. 10.3., и каждый 1000-й, следующий за ним в Списке, в количестве 69 Номеров Участника. Всего 70 призов.

10.10. Выигравшим Приз «Приз 6» в Розыгрыше считается 5 Номеров Участников, определенных согласно п. 10.3. Всего 5 призов.

10.11. В случае если выигрышный Номер Участника попадает на конец списка, то дальнейшее исчисление продолжается с начала списка кодов, которые участвуют в розыгрыше.

11. Место, порядок и срок выдачи призов и уведомления победителей.

Победители уведомляются о выигрыше по почте и по телефону. Победители розыгрышей Рекламной игры уведомляются не позднее **25 мая 2020 года**.

После получения уведомления о выигрыше Победитель должен **до 30 августа 2020 г.** в любой рабочий день с 12 до 17 часов либо в субботу, 25 апреля, 23 мая, 27 июня, 25 июля и 29 августа 2020 г., с 10.00 до 13.00 прибыть в офис Организатора по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 20/11, офис 509 с предварительным согласованием даты и времени прибытия победителя с представителем Организатора по телефону: +375 17 363 12 78.

При получении Призов «1–6» Победитель должен предъявить паспорт гражданина Республики Беларусь (или вид на жительство).

В случае отказа победителя от получения приза, неполучения приза в установленном правилами порядке и сроке либо невыполнения условий его получения приз признается невостребованным и остается у Организатора.

В соответствии с главой 18 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор при вручении Приза «1», Приза «2», Приза «3», Приза «6» выступает налоговым агентом и обязан удержать сумму подоходного налога непосредственно из доходов получателя приза.

Организатор не несет ответственности за возникновение необходимости уплаты дополнительного подоходного налога и иных выплат, связанных с получением Призов, за пределами Республики Беларусь.

Организатор не оплачивает Участникам Рекламной игры расходы, связанные с проездом к месту получения Призов.

Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента Призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче Призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видами этих Призов.

Организатор Рекламной игры не несет ответственности за любые риски, связанные с повреждением Призов и их эксплуатацией, возникшие после их передачи Победителям, а также за качество услуг, которые буду оказаны Победителю в соответствии с Призом.

12. Прочие условия.

Участие в Рекламной игре автоматически подразумевает ознакомление с полным текстом настоящих Правил и согласие Участников Игры следовать всем условиям настоящих Правил. Несоблюдение Участником настоящих Правил считается его отказом от участия в Рекламной игре со всеми вытекающими последствиями (включая утерю права на получение приза и т. п.).

Организатор не вступает в споры между Участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза, организации и условий передачи Призов. Приз получает Победитель. Победитель вправе распорядиться полученным призом по своему усмотрению.

Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участники соглашаются принимать участие в рекламной видеосъемке, что их фамилии, имена, отчества, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Рекламной игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Заинтересованному лицу.

Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

Все возможные претензии участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору Игры по адресу: Республика Беларусь, 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, 20/11, офис 509.

Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на интернет-сайте www.alfabank.by, а также по телефонам контакт-центра «Альфа-Консультант» 198, +375 (29, 44, 25) 733 33 32 круглосуточно.

13. Порядок информирования об условиях и результатах Рекламной игры

Правила проведения Рекламной игры вместе с реквизитами государственной регистрации публикуются до начала Рекламной игры в газете «Звязда», а также размещаются на сайте www.alfabank.by.

Информация о результатах розыгрыша публикуется до 22.05.2020 года в газете «Звязда», а также размещается на сайте www.alfabank.by.

Свидетельство № 3728 о регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 15 января 2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

ЯК ЗНАХОДЗЯЦЦА СТРАЧАНЫЯ РЭЛІКВІІ

Дырэктар музея гісторыі Магілёва Аляксей БАЦЮКОЎ пра пошукавую дзейнасць і цікавасць да аўтэнтыкі

Аб сенсацыйнай навіне пра тое, што ў Магілёў вярнуўся меч XV стагоддзя, «Звязда» паведаміла яшчэ на мінулым тыдні. Сёння ж мы хочам больш падрабязна расказаць аб пошуках. Супрацоўнікі музея гісторыі Магілёва зрабілі неверагоднае: знайшлі каштоўную рэліквію за мяжой. Меч заняў сваё пачэснае месца ў адной вітрыне з даспехам рыцара Сяргеннявечча і элементамі яго амуніцыі. Усе гэтыя рэчы належалі аднаму і таму ж воіну, які загінуў пры пераправе цераз раку Віхра на тэрыторыі сучаснага Мсціслаўскага раёна ў лістападзе 1501 года падчас бітвы ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім.

Незвычайны герб Магілёва.

Амуніцыю мсціслаўскага рыцара нарэшце папоўніў яшчэ і меч.

Па слядах каштоўнасці

Гісторыя пошуку рарытэта не менш цікавая, чым ён сам, і вартая таго, каб пераказаць яе зноў. Упершыню пра меч загаварылі ў 2013 годзе, калі паступіла інфармацыя ад жыхароў Мсціслава, што «чорныя капальнікі» перапрадалі яго ў Расію. Хто гэтыя зламыснікі, невядома. Ёсць здагадкі, што каштоўную рэч прысвоілі нядобрасумленныя мясцовыя жыхары, але даказаць гэта немагчыма. Разам з мячом невядомыя дасталі з дна Віхры яшчэ і даспех. Яго яны пакінулі археолагам, якія на чале з магілёўскім гісторыкам, доктарам гістарычных навук Ігарам Марзалюком правялі ў месцы стыхійных пошукаў арганізаваныя і знайшлі яшчэ шмат рэчаў з рыцарскай амуніцыі. Усе яны былі перададзены ў музей гісторыі Магілёва для захавання. Не хапала толькі мяча.

— Мы адразу сталі вывучаць абстаноўку, шукаць магчымасці натрапіць на след, — расказвае **дырэктар музея гісторыі Аляксей БАЦЮКОЎ.** — Але гэта ўдалося толькі праз два гады. Ігар Марзалюк падчас раскопак пазнаёміўся з адным месцічам, які нібыта ведаў, дзе меч. Той сказаў, што яго набыў масквіч і ён гатовы яго прадаць. Пачаліся перамовы з таямнічым калекцыянерам, нават былі спробы сустрэцца, каб выкупіць рэліквію, але здзелка не атрымалася. «Гульня» з абяцанкамі цягнулася каля тыдня, а потым прадавец зусім перастаў выходзіць на кантакт.

Але ў музеі разумелі, што меч дзесьці «ўсплыве» на аўкцыённых электронных пляцоўках. Зыходзячы з той інфармацыі, што ён трапіў у Маскву, уся ўвага была накіравана на расійскія сайты.

— За дзень праглядалі некалькі сотняў лотаў, але меч як скрозь зямлю праваліўся, — дзеліцца падрабязнасцямі дырэктар музея. — Вельмі дапамаглі нашы расійскія калегі — Аляксандр Нікалаеў, прадстаўнік расійскага ваенна-гістарычнага таварыства з Масквы, і супрацоўнік Эрмітажа з Санкт-Пецярбурга Андрэй Багданаў. Яны як спецыялісты па зброі цікавіліся даспехам, а заадно падключыліся да пошукаў нашага мяча. Праз некаторы час стала вядома, што меч у канцы 2018 года быў прададзены на адной з замежных інтэрнэт-барахолак. Мы спрабавалі прыцягнуць да крымінальнай адказнасці асобу, якая прадала беларускую каштоўнасць за мяжу, але праваахоўнікі паведамілі, што для гэтага не хапае доказаў. Заставалася толькі чакаць, калі меч зноў засвеціцца. І нарэшце ён з'явіўся на адным з сур'ёзных заходнееўрапейскіх аўкцыёнаў. Але ўжо цалкам абязлічаны, са знішчанай гісторыяй. З самага пачатку ён меў зламанае лязо — адсутнічаў кончык вастрыя. Па гэтай прыкмеце яго можна было лёгка апазнаць на папярэднім аўкцыёне. Гэтым разам кончык быў роўна спілаваны, і прадаваўся меч не як рыцарскі, паламаны ў бітве, а як экзекуцыйны. Пра Мсціслаў наогул не згадвалася. Адзінае, што ў апісанні ўскосна сведчыла пра яго беларускае паходжанне, гэта тое, што ён доўгі час знаходзіўся ў рацэ. Першапачаткова на рукаяці былі скураная абмотка і драўляныя накладкі, але яны згубіліся яшчэ раней. Ва ўсякім разе, на аўкцыёне ў 2018 годзе іх ужо не было. Меч яшчэ больш пакрыўся іржой. Але нахіл гарды, форма ляза, колькасць долаў — усё казала за тое, што перад намі мсціслаўскі меч.

Меч каштаваў 16 тысяч беларускіх рублёў, і патрэбная сума была хутка знойдзена. Сродкі на набыццё выдзелілі гарадскі бюджэт і Магілёўскае прадпрыемства цеплаэнергетыкі. З дастаўкай рарытэта з-за мяжы дапамагала камісія па вяртанні культурных каштоўнасцяў, у якую ўваходзяць прадстаўнікі розных міністэрстваў. Кіраўніцтва музея гісторыі Магілёва адрасуе асаблівыя словы падзякі начальніку ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Наталлі Хвір, міністру замежных спраў Уладзіміру Макею, супрацоўнікам Дзяржаўнага мытнага камітэта.

У музеі спадзяюцца высветліць імя майстра, які зрабіў меч. На яго рукаяці захавалася кляймо — шэсць квадратаў, якія формай нагадваюць крыж.

Экспанаты, якія сцвярджаюць, што Магілёву амаль тысяча гадоў.

Аўтэнтычнасць перш за ўсё

Музей гісторыі Магілёва адносна малады, але ў яго калекцыі становіцца ўсё больш сапраўды каштоўных рэчаў. Прычым не столькі па цане, колькі па сваёй прыналежнасці да горада.

— Мы ўвесь час у пошуку, — кажа Аляксей Бацюкоў. — Тыя рэчы, якія набываем, вельмі важныя для горада. Носьбітам каштоўнай інфармацыі можа быць нават гузік. Калі мы ведаем, што за мяжой знаходзіцца нейкі цікавы артэфакт, які мае непасрэдныя адносіны да нас, мы яго адсочваем і набываем. Дзякуючы спонсарскай дапамозе Валерыя Казакова ў нас нядаўна з'явілася кніга магілёўскага шляхціца Восіпа Турчыновіча «Агляд гісторыі Беларусі са старажытных часоў» 1857 года выдання. Напісана яна была ў Магілёве.

Сярод унікальных рэчаў — «Часоўнік», не ўлічанае дагэтуль выданне сярэдзіны XVIII стагоддзя. Кніга не ў найлепшым стане, але для Магілёва гэта каштоўнасць.

— Такія знаходкі могуць шмат чаго расказаць пра друкарню Багаяўленскага брацтва, — адзначае суразмоўца. — Яе дзейнасць апісана вельмі недастаткова і слаба вывучана. Мы ведаем, што існавала вялікая хваля выданняў для стараверaў. Яны друкаваліся ў 1700-я, 1710-я, 1730-я гады. А цяпер вядома, што яшчэ і ў 1750-я. На старонках гэтай кнігі ёсць вадзяны знак, з дапамогай якога мы даведаліся пра прыблізную дату выдання. Гэты знак належыць папяровай фабрыцы з Падмаскоўя, якая адкрылася ў 1745 годзе і перастала існаваць у 1750-я гады.

Кнігу, як і шмат іншых прадметаў, дапамог музею набыць Валерый Казакоў.

З музеем актыўна супрацоўнічаюць гісторыкі Дзмітрый Яцкевіч і Андрэй Радкоў — тыя самыя, з дапамогай якіх восем гадоў таму быў набыты Статут ВКЛ 1588 года. Акрамя гэтага Андрэй актыўна дапамагаў і з вяртаннем на радзіму мсціслаўскага мяча. Яшчэ адзін сябар музея — Алег Лісоўскі, былы магіляўчанін, які жыве цяпер у Аўгсбургу. З яго дапамогай музей набыў рэдкія фотаздымкі Магілёва часоў Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

— Хочацца знаходзіць рэчы, якія б здзіўлялі. Некаторыя прадметы часам вельмі мяняюць уражанне пра мінуўшчыну. Вось нядаўна наша супрацоўніца знайшла цікавы герб Магілёва з выявай рыцара, але без пагоні. Затое на ім ёсць каралеўская карона, — кажа Аляксей Бацюкоў. — Або малюнак, які таксама нядаўна трапіў на вочы ў інтэрнэце. На ім — супрацоўнік магілёўскага магістрата. Доўгія валасы, дэталі адзення — вельмі цікавы накід. Гэты малюнак размясціў у сацсетках Нацыянальны гістарычны архіў. Мы сістэматычна маніторым інтэрнэт, шукаем нешта характэрнае для Магілёва, аўтэнтычнае. Вельмі важна, каб нашы калекцыі маглі раскрыць гістарычнасць, унікальнасць нашага горада. Не хочацца, каб музей быў сховішчам стандартных антыкварных прадметаў, — хочацца, каб ён стаў рэпрэзентантам нашай культурнай традыцыі.

Колькі гадоў?

Калі ходзіш па залах музея гісторыі Магілёва, пачынаеш асабліва адчуваць душу горада. А яшчэ — гонар за тых людзей, якія робяць усё магчымае, каб вярнуць на радзіму яе скарбы. Два гады таму ў Магілёве прэзентавалі арыгінальны асобнік выдання «Апостала» Спірыдона Собаля 1632 года. Гэта адзіная кніга, якая выйшла на радзіме магілёўскага першадрукара. Пошукі выдання вяліся пяць гадоў. Фаліянт быў набыты ў аднаго з калекцыянераў у Еўропе. У гэтым музею дапамаглі ўсё тыя ж Валерый Казакоў, Андрэй Радкоў, Дзмітрый Яцкевіч і іншыя. Сярод рэдкіх выданняў таксама, акрамя Статута ВКЛ 1588 года, Новы запавет і Псалтыр XVII стагоддзя.

А вунь за той шкляной вітрынай можна ўбачыць цікавыя графіны, якія прадаваліся на аўкцыёне як царскія — са стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве.

Не менш каштоўныя здабыткі музея, знойдзеныя магілёўскімі археолагамі. Ёсць рэчы, якія ўскосна дазваляюць сказаць, што Магілёву болей чым 752 гады, і ён смела можа прэтэндаваць нават на 1000-гадовую гісторыю. Вось, напрыклад, манетападобная падвеска з выявай святога з аднаго боку і трызубцам — з другога. Яна, па словах экспертаў, была знойдзена на тэрыторыі Магілёва і магла належаць княжацкаму намесніку або іншаму статуснаму чалавеку. Іншымі словамі, можна меркаваць, што дзесьці ў пачатку тысячагоддзя на беразе Дняпра ўжо існавала нешта накшталт фарпоста. Прыкметы тысячагадовай гісторыі захоўваюць у сабе і каменная пячатка з трызубцам, посуд з характэрным кляймом, фрагмент плінфы з магілёўскага замка, скураны бранзалет з прарысоўкай на адвароце — «Жоод». У перакладзе з грэчаскай мовы гэтае слова азначае «зямля». Надпіс сведчыць пра тое, што ў XII стагоддзі магіляўчане ўжо былі пісьменныя.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

Фестывалім!

ДВАЦЦАЦЬ ГАДОЎ РАЗАМ: МУЗЫЧНЫ ПАДАРУНАК

У Заслаўі завяршылася свята камернай музыкі ў гонар Міншчыны

Дваццаты раз горад прымаў вялікае музычнае свята. «Сімвалічна, што юбілейны фэст сёлета праходзіў у юбілейны для горада год, — падкрэсліла старшыня Заслаўскага гарвыканкама Святлана КАРТАШОВА. — Заслаўе ў жніўні будзе святкаваць 1035-ю гадавіну з дня заснавання.

А пачалося свята ў дзіцячай школе мастацтваў, куды на конкурс «Заслаўскі сшытак» сабраліся юныя піяністы з аналагічных музычных устаноў Міншчыны. У творчым паядынку на найлепшае выкананне твораў беларускіх кампазітараў удзельнічалі 23 юныя музыканты ў трох узроставых групах. Вядома, дзеці моцна хваляваліся. Ды і як было не хвалявацца, калі журы ўзначальваў сам маэстра Міхаіл Фінберг. Цяжка было вызначыць пераможцаў. Але ўсё ж першае месца ў малодшай узроставай групе было прысуджана вучаніцы Салігорскай дзіцячай музычнай школы Ефрасінні Ждановіч. У сярэдняй ўзроставай катэгорыі перамогу падзялілі Яніна Янкевіч з Вілейкі і Маргарыта Таўгень з Маладзечна.

Як адзначылі члены журы, выступленні дзяцей з кожным годам становяцца ярчэйшымі, удасканальваецца іх майстэрства. Па словах **загадчыцы аддзялення «Мастацтва» Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў Вольгі ПАЛІТЫКІ,** ніводнага твора выканаўцы сёлета не сыгралі двойчы. Гэта сведчыць пра тое, наколькі багаты і разнастайны рэпертуар айчыннай музыкі.

Пасля заканчэння конкурсу своеасаблівы майстар-клас паказалі прысутным салісты калектыву Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам прафесара Міхаіла Фінберга: Ганна Брылёва на фартэпіяна і Мікалай Мішчанка на кларнеце.

Па традыцыі, прэс-канферэнцыю для журналістаў і прыхільнікаў яго творчасці правёў сам маэстра.

— Як удалося на працягу дваццаці гадоў захаваць фэст, прымножыць яго творчымі набыткамі, новымі талентамі? — запыталіся ў яго.

— Мы пачыналі справу з былым мэрам Заслаўя спадаром Валянцінам Раманавічам Сітнікам. Цудоўны, прыстойны чалавек, ветэран афганскай вайны. Разам з ім мы працавалі ў любое надвор'е, часам і ў траскучыя маразы. Але ні разу за ўвесь час не ўзнікала думкі адмяніць свята. Таму што мы шануем беларускую песню, культуру, радуемся, што нясём людзям дабро. На працягу двух дзесяцігоддзяў мы не мянялі фармат мерапрыемства, таму што ў нас такая нацыянальная палітыка, якая падштурхоўвае любіць дзяржаву, людзей.

— Міхаіл Якаўлевіч прадстаўляе цэлы пласт гісторыі, культуры нашай Беларусі. І гэты пласт ён прынёс у адзін з найстарэйшых гарадоў краіны. Фестываль быў успрыняты жыхарамі як нешта неабходнае ў паўсядзённым жыцці, стаў для кожнага прыступкай, якая далучае да прыгожага, высокага, — лічыць Валянцін Раманавіч.

Усяго ж Міхаіл Фінберг зрабіў 97 аўтарскіх канцэртаў, стаў ідэйным натхняльнікам і арганізатарам 752 фестываляў.

У межах мерапрыемства была прадстаўлена выстаўка «Казачны свет Ганны Сілівончык». Ганна — маладая мастачка, ды ўжо заявіла пра сябе не толькі ў Беларусі, але і за мяжой. Яе работы створаны ў непаўторным аўтарскім стылі — своеасаблівай трансфармацыі наіўнага і фантастычнага рэалізму. Яны нязменна ўражваюць вобразамі, поўнымі неверагоднай ўнутранай сілы, жыццёвай энергіі і аптымізму. «Знаёмства з творчасцю мастачкі можна параўнаць з падарожжам у цудоўную рэальнасць, — пракаментавала адна з наведвальніц. — На карцінах адлюстравана мноства разнастайных персанажаў — дзеці, закаханыя, людзі-жывёлы, людзі-птушкі, людзі-анёлы, ільвы і міфалагічныя істоты. Напачатку гэты свет здаецца нам таемным і загадкавым. Але кожны можа знайсці тут ключы і падказкі да разумення і чытання алегарычных сімвалаў ды зашыфраваных рэалій».

Пасля выстаўкі адухоўленыя людзі з узнёслым настроем і ўражаннямі ад сустрэчы з цудоўным мелі магчымасць паслухаць канцэрт творчых калектываў Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі. Сярод выканаўцаў — струнны аркестр, ансамблі флейтыстаў, трубачоў, дуэт фартэпіяна і кларнета.

«Міхаіл Якаўлевіч прадстаўляе цэлы пласт гісторыі, культуры нашай Беларусі. І гэты пласт ён прынёс у адзін з найстарэйшых гарадоў краіны. Фестываль быў успрыняты жыхарамі як нешта неабходнае ў паўсядзённым жыцці, стаў для кожнага прыступкай, якая далучае да прыгожага, высокага».

Завяршальным акордам фестывальнага дня стаў канцэрт у Заслаўскім гарадскім доме культуры «Світанак» — «20 гадоў разам: музычны падарунак». Сапраўдны россып зорак у адной зале! Для гледачоў выканалі творы салісты-лаўрэаты міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў. Сярод іх — заслужаныя артысты Беларусі: Наталля Тамела, Таццяна Глазунова, Галіна Грамовіч і іншыя.

Пры гэтым Міхаіл Фінберг адзначыў, што яго аркестр і артысты спяваюць і іграюць без выкарыстання фанаграмы, што выгадна адрозніваe іх ад іншых музычных калектываў і выканаўцаў.

Нагадаю, што Міхаіл Фінберг напярэдадні фестывалю трапіў у бальніцу, але праз пяць дзён быў выпісаны. Міхаіл Якаўлевіч запэўніў прыхільнікаў сваёй творчасці, што падстаў для хваляванняў няма, ён адчувае сябе добра: «За ўсё жыццё ўпершыню трапіў у бальніцу, і журналісты паднялі вэрхал. Я ж у бальніцы рыхтаваўся да гэтага фестывалю, — пажартаваў маэстра. — А калі сур'ёзна, то я здаровы. Будзем разам працаваць на карысць нашай Айчыны», — дадаў ён напрыканцы.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Гарадская прастора

Труба кліча...

У Брэсце з'явілася новая традыцыя гукаць поўдзень

Над воднай гладдзю вяслярнага канала праляцелі глухаватыя трубныя гукі, вецер аднёс іх на добрую адлегласць. Брэсцкі вяшчун паведаміў навакольлю, што горад над Бугам жыве, функцыянуе, развіваецца, а ў горадзе роўна поўдзень. Нягледзячы на густы туман, які не рассеяўся нават да абеду, паглядзець на новую дзею сабралася нямала гараджан.

Да пачатку мерапрыемства з журналістамі пагаварыў **галоўны натхняльнік і арганізатар новага праекта, вядомы брэсцкі шакаладзье, гаспадар магазіна-кавярні Аляксандр СКІНДЗЕР.** Ён жа — кіраўнік гарадскога культурна-асветніцкага таварыства «Гарадскія легенды». Паводле слоў Аляксандра, разам з аднадумцамі яны вырашылі ажывіць яшчэ адну гарадскую легенду — паданне пра старадаўняга трубача.

— Гісторыкі да гэтай пары спрачаюцца, ці быў у старажытным Бярэсці трубач-вястун, які з дапамогай гучнага інструмента аб'яўляў найважнейшыя падзеі і абвяшчаў час. Іх дыскусіі могуць зацягнуцца на дзесяцігоддзі. А мы тым часам зрабілі праект, разлічаны на павелічэнне турыстычнай прывабнасці горада. Ды і цалкам імаверна, што ў горадзе, які першы на нашай тэрыторыі атрымаў магдэбургскае права, быў менавіта такі элемент інфраструктуры. Гарадская ратуша ў тыя часы будавалася з вежай і гадзіннікам, значыць, і трубач павінен быў трубіць.

Аляксандра ў яго задумцы падтрымалі таварышы па культурна-асветніцкай суполцы — старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі рамеснікаў Жан Васько, брэсцкі актывіст Алег Голас, кіраўнік тэатра жывых скульптур «Ларчык» Віталь Ларчык. Менавіта тэатр працаваў над макетам інструмента, стварай касцюмы трубача і яго памагатых.

Драўляны інструмент, назвы якому пакуль не прыдумалі, зрабілі іванаўскія бондары. Для вырабу яго выкарыстоўвалася старадаўняя каўказская тэхналогія. Гэта нават не цэльная труба, а зборная канструкцыя з некалькіх сегментаў. Яе даўжыня складае чатыры метры, а вага — каля 30 кілаграмаў. Такі інструмент не паднімеш у адзіночку, затрубіць: тым больш зможа не кожны, а толькі той, хто мае моцныя лёгкія. Інструмент зроблены з айчыннай драўніны — елкі.

Дарэчы, падчас абмеркавання ідэі і падрыхтоўкі рэалізацыі паступалі прапановы і з суседняй вобласці, і з суседняй краіны выкупіць праект цалкам. Але наш трубач грамадзянства не памяняў. І ў час першай дзеі-інсталяцыі на балкон выйшлі пажы ў касцюмах колеру гарадскога герба. Перш чым падысці да інструмента, трубач развесіў штандары ва ўсіх чатырох напрамках. І толькі потым, роўна ў 12 гадзін, прагучалі тры сігналы.

Так цяпер адбываецца кожны дзень. У поўдзень па навакольлі раздаецца сігнал горада. Пляцоўка трубача размяшчаецца на шостым паверсе судзейскай вежы Цэнтра алімпійскага рэзерву па веславанні, каля Вяслярнага канала. Падчас прэзентацыі новага праекта ў арганізатараў пыталіся, чаму гарадскі вястун прапісаўся менавіта тут, а не ў цэнтры горада, напрыклад, каля ЦУМа, дзе ёсць высокая вежа з гадзіннікам, а насупраць гарадская славутасць — ліхтаршчык, які вечарам запальвае святло ўручную. Аляксандр Скіндзер заўважыў, што Вяслярны канал — гэта таксама не ўскраіна, а хутчэй цэнтр. Тут, напрыклад, праходзіла галоўная дзея падчас святкавання тысячагоддзя горада. І яшчэ каля вады цудоўная рэхалакацыя, якая ўзмацняе гук: як вядома, нават спевы над вадой гучаць мацней і прыгажэй. «Калі справа знойдзе водгук у гараджан і турыстаў, магчыма, трубач з часам памяняе дыслакацыю. Важна раскруціць праект», — кажуць арганізатары. У любым выпадку пад гук трубы з'явіцца дадатковая нагода згадаць гісторыю малой радзімы, звярнуцца да яе мінулага. У зоне дасягнення гуку знаходзяцца цяпер тры школы, а значыць, ёсць патэнцыйная аўдыторыя для падобных экскурсаў.

Застаецца дадаць, што праект ажыццёўлены на ахвяраванні, а трубач будзе працаваць як валанцёр без усякай аплаты. Для роднага горада.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Валерыя КАРАЛЯ.

«...ПАКІНЬЦЕ МНЕ МОВУ МАЮ, ПАКІНЬЦЕ ЖЫЦЦЁ МНЕ!»

...Аляксандра ў свае чатыры гадкі і танцорачка, і пяюха... Любімая песня (яна ж загадка) пра тое, як *«...далеко, далеко на лугу пасутся ко...»*
Для дзяцей пытанне ў тым, коні, козы ці каровы. Для дарослых, і ў прыватнасці сёлета, — чаму пасуцца ў... студзені, на Вадохрышча?
Па адной з версій, зіма з маразамі ды завеямі да нас прыходзіла, але ўбачыла тарыфы на ацяпленне і, усё зразумеўшы, сышла.

ДАЎ СЛОВА — СТРЫМАЙ!

Хабар у асабліва дробных памерах — слоічак маслячкоў: марынаваных, светленькіх, невялічкіх...

Пакуль частаваліся, часам ганяючы іх па талерцы, міжволі ўспомнілі дзеда-вяскоўца, якому ўнучка загадала, каб еў «па-гарадскому», відэльцам — і пры іншых, і без...

Дзед абяцаў. І ў яго атрымалася — з усімі стравамі, а вось маслячкі...

Самы першы з іх выскачыў з талеркі на стол.

Але і там стары яго не залавіў — грыбок, уцякаючы ад відэльца, саслізнуў на падлогу...

Нехта іншы, можа, яго падфутболіў бы ці падняў рукою — дзед, што называецца, заеўся, сказаў: «Я ж цябе ўсё роўна злаўлю!»...

І такі стрымаў сваё слова: загнаў маслячка ў кут і падчапіў — відэльцам...

ЖЫЦЦЁ ЯК АНЕКДОТ

Кажуць, некалі даўно не «раскручаныя» тады Алейнікаў са Стаянавым запланавалі вялікае турнэ па гарадах Расіі, замовілі афішы: маўляў, там і там, у такія і такія дні адбудуцца канцэрты.

Потым тэлефанавалі арганізатарам — пыталіся: ці прадаюцца білеты? «Прадаюцца, — з радасцю адказвалі ім, — але не купляюцца».

...Усё амаль як у нас: і акцыі, і зніжкі, і распродажы, і ліквідацыі — крамы завалены таварам, прадаецца, як выглядае, усё! А вось купляецца...

Жыццё — як анекдот: на кожным кроку аптэкі, цырульні, банкі... А люд вакол — нездаровы, нястрыжаны і, на жаль, небагаты.

КАБ СКАЗАЦЬ... І ПАЧУЛІ*

...У пад'ездзе (ці нават доме, дзе пад'ездаў з дзесяць) гэта ведалі ўсе: калі трэба на нешта грошай — схадзі да Жоры: у яго ёсць, прычым заўсёды. Адкуль?

Пазычальнікі меркавалі, што яму дапамагаюць родныя, што яны ж прывучылі эканоміць... Ды, як выглядае, памыляліся, бо, калі спыталі, Жора найперш прыгадаў не бацькоў, а бабулю-вахцёрку.

Банальная зусім гісторыя.

Пасля службы ў войску хлопец прыйшоў на завод, атрымаў ложка-месца ў рабочым інтэрнаце, неяк дацягнуў да першай зарплаты. Яе — хлопцы сказалі — трэба «замачыць». Ды ён і сам гэта ведаў: пасля работы зайшоў у краму, накупляў гарэлкі з віном, добрай закусі... Сумку нёс — як падняць!

На ўваходзе ў інтэрнат вахцёрка спыніла, сказала:

— Сынок, ты, я бачу, тут новенькі? Малады... Табе яшчэ жыць і жыць. Хочаш, каб нейкая капейка за душою была, каб потым — добрая жонка, сям'я?..

— А хто ж не хоча? — паспрабаваў аджартавацца хлапец.

— Тады паслухай, што я скажу: ніколі не выпівай з палучкі.

— Гэта чаму?

— А ты вось зараз трохі ўстрымайся, вочы не залівай — паглядзі на сваіх суседзяў.

...У той вечар (і ў пятніцу якраз) яны — Жора бачыў — паддалі будзь здароў: той гарэлкі, што ён прынёс, аказалася мала, двойчы пасылалі «ганцоў» па дабаўку і пасля яе ледзьве распаўзліся.

Назаўтра, у суботу, сабраліся зноў — проста пахмяліцца, узяць па чарцы, аднак спыніцца, на жаль, не змаглі.

У нядзелю ўсё пачалося спачатку.

У панядзелак дзень быў цяжкі. Многім на рабоце балелі галовы, многія аддавалі даўгі, а недзе праз тыдзень у іх жа залазілі: не было з чым схадзіць па хлеб.

«Я так жыць не хачу», — паглядзеўшы на гэта, вырашыў Жора і, у чарговы раз атрымаўшы грошы, стаў казаць сваім хлопцам, што яму трэба з'ездзіць у вёску да бацькоў, да брата, да пляменніка на дзень нараджэння, да дзяўчат... Сярод якіх і досыць хутка знайшлася кандыдатка ў жонкі. Згулялі вяселле, стварылі сям'ю.

...Яна ў іх, і праўда, харошая: двое дзяцей, кватэра, машына... Усё так, як казала бабуля-вахцёрка. І напэўна ж, не толькі яму, Жору, — многім!

Шкада, што нямногія слухалі.

РЭЧ!

Міцеву сяброўку завуць Мілена. Прыгожае імя! Адно што дзед яго пастаянна забываецца: за вочы заве дзяўчыну то Мар'янай, то Мальвінай, то Матронай, а то раптам... Фросяй.

Гэтыя імёны яму, падобна, бліжэйшыя? Як нам цяпер — Акуліна... І нават Міканораўна: падушка ад яе дасталася — невялічкая, бязважкая... Сама зрабіла — з гусінага пуху, цёплага, як імя.

СМАГА

Каляды, горад, праспект. Напярадзе — відаць здалёк і па ўсім (вопратцы, бруднай вялікай сумцы, абутку) нейкі бяздомнік. Памалу ідзе — ад сметніцы да сметніцы, у паўнейшыя зазірае, з адной — дастае бутэльку з астаткамі «кока-колы»...

Голас дзіцяці:

— Дзед, а давай дадзім дзядзьку грошай... Ён купіць сабе папіць.

— Не, унук, гэта — дрэнная ідэя, — кажа дзядуля. — Давай лепш аддадзім яму сок, бо за грошы...

Мужчына недагаворвае. Ды і малы яго слоў не чакае: ён, падобна, усё разумее і так.

СВАЁ І ЧУЖОЕ

У слова «размаўляць» ці не сто сінонімаў: тут і гутарыць, і балабоніць, і плявузгаць, і гергетаць, і талкаваць, мазоліць язык, пераліваць з пустое ў парожняе, мець гутарку...

Тут і зараз — адна, можна сказаць, выпадковая, бо магла і не пачацца:

— Добры дзень! — павіталіся мы, адчыніўшы дзверы ў майстэрню.

— *Добрый то добрый, но ведь не день,* — не згадзіўся з намі нейкі мужчына. — *Утро ещё.*

— А беларусы, — кажу, што ведаю, — дзень не дзялілі, звычкі такой не мелі.

«Праўда?» — насцярожылася чарга.

— Ды адкуль ёй брацца, гэтакай звычцы? — на беларускую мову і, здаецца, з ахвотаю перайшоў крытыкан. — Яны ж за работай свету не бачылі! Дзе ім адсочваць, раніца там ці дзень? Я праўду кажу?

Чарга, відавочна, згаджаецца, хто-ніхто з яе — зусім невялічкай — можа, успамінае сваіх бацькоў ці дзядоў, якія і праўда не разгіналіся — шчыравалі на рабоце і дома, без адпачынкаў, без выхадных... І не сказаць, каб што «лішняе» мелі.

— Во-во! — нібы чытаючы гэтыя думкі, усклікае мужчына. — Лепей было не працаваць, а... Як там: калі хочаш жыць у шчасці, трэба красці, красці і красці. Не ведаеце, адкуль гэты выраз?

Пытанне яўна да нас, і ў адказ на яго паціснуць плячыма — неяк не выпадае. Тады, што называецца, думкі ўслых — пра тое, што некалі з пачаткам халадоў тутэйшыя жанчыны ўносілі ў хаты калаўроты: пралі воўну і кудзелю — рабілі ніткі, з якіх потым ткалі абрусы, ручнікі, палатно для пасцельнай бялізны... І чым болей пралі ды ткалі, — тым лепшыя мелі пасагі, а значыць, большыя шанцы на тое, каб выбраць добрых жаніхоў... Адкуль — «Калі хочаш жыць у шчасці, трэба **прасці**...»

З часам, праўда, гэта рабіць перасталі: змяніліся парадкі, а следам — і першая літарка ў слове.

— Во! Яно ж, мусіць, праўда! Усё так і ёсць! — радуецца дзядзька...

Пад размову і зусім неўпрыкмет мы здаём у рамонт свой абутак.

Майстар-армянін моўчкі прымае і на адыход нам кажа «Да пабачэння!».

Слова, якое далёка не заўсёды пачуеш ад людзей тутэйшых, сыходзячы з работы, з нашых кавярняў і цырульняў, з невялічкіх крам, кабінетаў урачоў і тэ дэ і тэ пэ.

«ТОЛЬКІ МЕСЯЦАЎ НАЗВЫ ПАКІНЬЦЕ...»

З кнігарні грэх сысці без пакупкі, у ёй не раздражняе нават чарга да касы — можна і пастаяць.

Кабета, што ў нас напярадзе, трымае календары — насценныя, досыць прыгожыя, беларускамоўныя...

— Дочкі папрасілі купіць, — згледзеўшы нашу цікавасць, тлумачыць жанчына. — Яны ў Германіі цяпер жывуць. Абедзве замужам...

А значыць, недзе там, у іх кватэрах-дамах будуць

...Студзень —
з казкамі снежных аблокаў,
Люты — шчодры на сіні мароз,
Сакавік —
з сакатаннем і сокам
Непаўторных вясновых бяроз.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Назвы месяцаў, паводле Панчанкі...

Хоць яны.

Дарэчы (і, мусіць, яшчэ раз?), апошнія радкі ў гэтым вершы *(«...Ці плачу я, ці пяю, / Ці размаўляю з матуляю — / Мову сваю, песню сваю / Я да грудзей прытульваю»...),* заўсёды здаваліся выпадковымі, нібы чужымі...

Аказалася, што прыблізна так яно і ёсць. У паэта (адчуйце розніцу!) спачатку было:

...Ці плачу я, ці пяю?..
Восень.
На вуліцы цёмна...
Пакіньце мне мову маю,
Пакіньце жыццё мне!

СМЕЛЫМ БОГ ПАМАГАЕ

Суседка, як многія, як амаль усе ў вялікіх гарадах, размаўляе па-руску. Па-беларуску таксама здараецца, праўда, слоў малавата, ды і памылак шмат.

Надоечы вось расказвала, як з'ездзіла ў вёску да сяброўкі, як схадзілі там да яе бабулі з дзедам, як хораша пасядзелі — перад печкай, «на дыване»...

— Дык вам жа нязручна было, — перабівае расказчыцу муж. — Немаладыя ўжо... На падлозе...

Складанасці перакладу: *«ковёр»* — гэта па-нашаму «дыван», а *«диван»* — «канапа», *«арбуз»* — «кавун», а *«тыква»* — «гарбуз», *«ложка»* — не тое, чым ядуць, і *«стул»* — зусім не тое, на чым сядзяць...

Мы добра ведалі б гэта, калі б мову чулі ўсюды, каб на ёй размаўлялі, чыталі, аднак...

Досыць сімпатычны знаёмец па-беларуску расказваў, як аднойчы спужаўся, прычым так, што ледзь не самлеў — не страціў (даслоўна)... свядомасць (замест прытомнасць).

...Колькі ж нас, такіх вось спалоханых? Большасць. А смелых? Хіба адзінкі.

Але ім, як кажуць, памагае Бог.

ДУМАЙ, ШТО ГАВОРЫШ

Паліклініка як мурашнік — прынамсі, з раніцы, калі натоўпы ў чарзе па талоны.

— Мне ў даўрачэбны, — кажа ў акенца пажылая жанчына.

— Што здарылася? — удакладняюць адтуль.

— Рэцэпт бы выпісаць...

— Тады вам да тэрапеўта.

— Не... Мне раней у даўрачэбным выпісвалі, я на ўліку — з анкалогіяй...

— Ну і што? — кідае ў адказ маладзіца. — Падумаеш...

Можа, грэх на душу, але ж часам каму-нікаму і нялішне было б паставіць гэты дыягназ, даць накіраванне на здымкі, аналізы... Хай бы пахадзіў чалавек, хай бы пераканаўся, што памыліліся дактары, што нічога такога ў яго няма.

А паралельна хай бы падумаў, хоць трохі. Яшчэ і над тым, што каму казаць, а што не.

ПАЧАТАК

Даказана: самы кароткі дзень — не 21 снежня, а трохі пазней — 1 студзеня, калі спаць многія кладуцца ледзь не пад раніцу і ўстаюць — пад абед, у найлепшым выпадку.

Якраз на яго, вось такі, найлепшы, разлічвалі дарослыя госці цёткі Мар'яніхі (яе дочкі, зяці), але...

Ледзь свет (на дзень яшчэ не займалася), успароліся малыя ўнукі, знайшлі пад ёлкай падарункі, што прынёс Дзед Мароз, сталі шумець ды выхваляцца адно перад адным, прасіць, каб дасталі ім салдацікаў з кіндар-сюрпрызаў *(хто не ведае — з шакаладных яек, унутры якіх пластыкавыя каробачкі з цацкамі).*

Бабулі — нідзе ж не дзенешся — давялося згадзіцца, узяць малаток, стукнуць па адной «пластмасцы», потым па другой: нарабіць грукату, пабудзіць зяцёў.

— Блін, з чаго пачынаецца год! — абурыўся старэйшы. — У першую ж раніцу... Малатком... Па яйках...

І сапраўды — вясёленькі пачатак.

У кожнага свой.

ЗА ЎДАЧУ!

Піць — гэта, на жаль, па-нашаму, за здароўе — і пагатоў, бо яно ж галоўнае.

А зрэшты, можа, і не? Ва ўсякім разе, адзін з застольнікаў, свежыной закусіўшы трэцюю чарку, раптам засумняваўся, сказаў:

— Паслухайце, мужыкі, мы з вамі — і толькі што — закалолі парсюка. Ён здаровы быў? Яшчэ і які! Ды яму не пашчасціла! Таму — за ўдачу!

...Кажуць, што чалавек носіць яе на кончыку носа. Спінка роўная? Нос задраны? Значыць, удача на месцы, а калі не...

Высновы — за вамі.

Валянціна ДОЎНАР.

*** Так называлася кніжка з амаль тысячай такіх вось абразкоў, якая выйшла ў выдавецтве «Харвест». Выйшла гадоў колькі таму, але, як аказалася, дагэтуль прадаецца: у сталічнай «Акадэмкнізе» (а магчыма, і не толькі?) яе можна купіць. Чытво, вядома ж, на аматара. Калі вы з такіх — пытайцеся.**

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 6 февраля 2020 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 25 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
